14 ПЫТАННЯЎ ПРА ПЕНСІІ 7

МАКСІМ БАГДАНОВІЧ - «МУЛЬЦЯШНЫ» ГЕРОЙ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

14 СНЕЖНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 241 (29610)

КАРАТКА

- **Амаль два мільёны салодкіх падарункаў зробяць у Беларусі да навагодніх свят.**
- Больш за 106 тысяч тон другсыравіны нарыхтавалі ў Гомельскай вобласці ў студзені—лістападзе.
- **У Мінскай вобласці за выхадныя затрыманы 28 нецвярозых кіроўцаў.**
- Больш за сто Дзядоў Марозаў і Снягурак пройдуць па вуліцах Барысава 19 снежня.
- **Кіраўнік пост-місіі МАГАТЭ адзначыў прыхільнасць Беларусі да забеспячэння ядзернай бяспекі.**
- ААН: з пачатку 2021 года ў свеце загінула больш за 4,4 тысячы мігрантаў.
- **У Мінску ўручана Міжнародная бізнес-прэмія «Лідар года 2021».**
- Дом сумеснага пражывання для адзінокіх пажылых людзей уладкавалі ў Камянецкім раёне.

ЦЫТАТА ДНЯ

Людміла КАНАНОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў:

«Ёсць такая тэндэнцыя ў нас у краіне да павелічэння сярэдняга ўзросту пры ўступленні ў першы шлюб. Мы сёння канстатуем, што ў жанчын гэта 26 гадоў, у мужчын — 28. Вядома ж, павышэнне ўзросту нараджэння дзяцей. Але тут я хачу адзначыць такую станоўчую тэндэнцыю: намеціўся рост нараджальнасці ў жанчын ва ўзросце ад 40 да 44 гадоў. І больш як 50 працэнтаў гэтых дзяцей — трэція і наступныя, а гэта тэндэнцыя да таго, што ў нашай краіне павялічваецца колькасць шматдзетных сем'яў».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Не тое што няправільных — недакладных крокаў быць не павінна»

Новыя кіраўнікі Віцебскай і Магілёўскай абласцей і абноўлены ЦВК — кадравы панядзелак у Палацы Незалежнасці

Прэзідэнт Беларусі прызначыў віцэ-прэм'ера Аляксандра Субоціна старшынёй Віцебскага аблвыканкама, а кіраўніком Магілёўскага аблвыканкама — намесніка старшыні Савета Рэспублікі Анатоля Ісачанку. Міністр адукацыі Ігар Карпенка атрымаў пасаду старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пры назначэнні на гэтыя пасады ішла карпатлівая работа: памылкі сёння ў кадрах недапушчальныя. «Час сёння настолькі спрасаваны, што не тое што няправільных — недакладных крокаў быць не павінна. Вы гэта разумееце не горш за мяне, бо знаходзіцеся ў верхнім эшалоне ўлады», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

ВОПЫТНЫ КІРАЎНІК І АРГАНІЗАТАР

Па словах Прэзідэнта, калі народ падтрымае змены ў Канстытуцыю, то кандыдатура кіраўніка Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў будзе вылучана на зацвярджэнне Усебеларускага народнага сходу.

«Нас чакае няпросты час, пачынаючы з рэферэндуму. Вы чалавек вопытны і ў гарвыканкаме працавалі. Ведаеце, што такое электаральная кампанія. Затым нам належыць упершыню ў гісторыі ў адзіны дзень галасавання абраць нашы Саветы, заканадаўчы орган улады — парламент. І, зразумела, выбары Прэзідэнта. Здаецца, і далёка яны, але не так», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён заўважыў, што былому міністру, як кажуць, прыйдзецца акунуцца з агню ды ў полымя.

Ігар Карпенка стане, верагодна, першым старшынёй ЦВК, якога абяруць і на УНС. «Выбарачны працэс змяняецца ў Канстытуцыі для таго, каб ён быў больш незалежны і каб людзі не думалі, што выканаўчая ўлада, кіраўнік краіны будзе ціснуць на выбарчы працэс праз Цэнтральную выбарчую камісію і рэгіянальныя, тэрытарыяльныя камісіі. Вы гэта разумееце», — акцэнтаваў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што, прапануючы такія змены ў Канстытуцыю адносна ЦВК, павышаецца і роля гэтага органа. Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз дадаў: Ігар Карпенка — вопытны кіраўнік, які ўдзельнічаў у выбарчым працэсе і разумее яго сутнасць «ад зямлі».

Фота БелТА.

«Таму я вельмі разлічваю, што ў вас атрымаецца гэта адказная арганізатарская работа», — заўважае Прэзідэнт.

Пераводзячы міністра адукацыі ў ЦВК, Аляксандр Лукашэнка не адыходзіць ад праблемы, хто зойме месца на чале гэтага міністэрства.

«Мы павінны не памыліцца з падборам на адну з ключавых пасад — новага міністра адукацыі. Нікуды ад вас гэта работа не сыдзе, і прапаноў па новым міністры мы чакаем і ад вас. Пакуль новы міністр не ўвойдзе ў курс справы, вам прыйдзецца гэтым займацца. Будучы старшынёй ЦВК, у вас будзе час адцягваць увагу на дзяржаўную работу ў сістэме адукацыі», — адзначыў Прэзідэнт.

Канчаткова ўзгадніць новы склад ЦВК павінен на працягу некалькі дзён Савет Рэспублікі, толькі тады Ігар Карпенка можа фармальна ўступіць у сваю пасаду.

СТАР. 2

Парламенцкі дзённік

У КРАМУ З «ДЭПУТАЦКІМ СПІСАМ»

На Гомельшчыне парламентарыі і прафсаюзы працягваюць маніторынг цэн на сацыяльна значныя тавары і лекавыя прэпараты. Асноўная задача — спрацаваць на «прафілактыку» спажывецкага ажыятажу і дэфіцыту. У зоне ўвагі — буйныя гарадскія і маленькія сельскія крамы, а таксама рыначныя гандлёвыя рады. Кантралююцца цэны, устаноўленыя «сецівікамі» і вытворцамі. Пры выяўленні фактаў завышэння цаны для прыняцця мер рэагавання інфармацыя перадаецца ў МАРГ.

На пачатку месяца ў рэгіёне падобную работу актыўна распачалі сенатары. **Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве старшыня абласнога аб'яднання прафсаюзаў Аляксей НЯВЕРАЎ** вывучыў цэны на сацыяльна значныя тавары ў крамах Гомеля.

СТАР. 3

Ахова здароўя

ВЫЙСЦІ З «ЧЫРВОНАЙ» ЗОНЫ

Круглянская раённая бальніца цалкам вярнулася да работы ў звычайным рэжыме

На Магілёўшчыне каранавірус у цэлым пайшоў на спад, а ў Круглянскім раёне сёння наогул фіксуюцца адзінкавыя выпадкі. У параўнанні з тым, як тут было некалькі тыдняў таму, калі дыягназ «ковід» ставілі адначасова 10—12 чалавекам на працягу дня, гэта мінімум. Бальніца ўжо цалкам перайшла на звычайны рэжым работы. А калі выяўляецца пацыент з каранавіруснай інфекцыяй, яго тэрмінова дастаўляюць у інфекцыйную бальніцу ў Магілёў. Так, кажа кіраўніцтва раённай бальніцы, эканамічна больш апраўдана.

СТАР. 6

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцавы

ISSN 1990 — 763X

«Не тое што няправільных — недакладных крокаў быць не павінна»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У склад ЦВК таксама ўвайшлі Вадзім Іпатаў, дырэктар НЦЗПД, Алена Балдоўская, начальнік упраўлення арганізацыі прававога абслугоўвання галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінскага аблвыканкама, Дзяніс Дук, рэктар МДУ імя А. А. Куляшова, Сяргей Каліноўскі, намеснік міністра юстыцыі, Аляксандр Южык, першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення юстыцыі Гродзенскага аблвыканкама.

ПРА ГУБЕРНАТАРАЎ

Прэзідэнт заўважыў, што Аляксандр Субоцін заўсёды быў неабыякавы да Віцебскага рэгіёна — зразумела, сам ён віцябчанін.

«Вы менавіта ў Віцебскай вобласці сталі вядомым чалавекам, вучоным, выкладалі там. Там ваша ўсё, нарадзіліся вы таксама ў Віцебскай вобласці. Гэта ваша», — сказаў кіраўнік краіны, адзначыўшы, што ў рэгіёне ў плане работы ёсць дзе разгарнуцца. Больш за год таму ў вобласці пачаліся рэформы ў сферы сельскай гаспадаркі — стварэнне вытворчых інтэграцыйных структур.

«Мы з вамі як з віцэ-прэм'ерам дамаўляліся, што сур'ёзна паглядзім, як ідуць справы ў Віцебскай вобласці. Мы больш не можам спакойна глядзець, як вырашаюцца некаторыя пытанні. А менавіта: не па ўсіх кірунках яны вырашаюцца так, як мы меркавалі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт акцэнтаваў, што Аляксандр Субоцін акрамя рэалізацыі праекта інтэграцыйных структур асабіста кіраваў складанымі працэсамі на Аршанскім мясакамбінаце. Нагадаў кіраўнік краіны і аб праблемах Мёрскага металапракатнага завода.

«Ёсць там пэўныя недахопы, звязаныя і з крымінальнай адказнасцю тых, хто гаспадарыў на гэтым заводзе. Вы азнаёмцеся дакладна з гэтым пытаннем, таму што я збіраюся ў Мёры прыехаць і паглядзець на гэта прадпрыемства», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

Папрасіў ён захаваць супрацоўніцтва з былым губернатарам Мікалаем Шарстнёвым і прыслухоўвацца да яго парад. «Ні адзін губернатар не застанецца за бортам, без справы. Яны зрабілі свой унёсак у развіццё абласцей. Але неабходны новыя людзі. Яго вопыт трэба выкарыстоўваць. Ён нядрэнны тактык і стратэг у галіне сельскай гаспадаркі», — падзяліўся думкамі кіраўнік краіны.

Адносна Анатоля Ісачанкі Аляксандр Лукашэнка пажартаваў: рад, што той няўтульна сябе адчувае «ў кабінеце», мае патрэбу ў канкрэтнай працы. «Куды ж тады, як не ў Магілёўскую вобласць? Гэта таксама ваша вобласць. Ведаеце там кадры лепш, чым я, і хто б ні быў. Мне падабаецца ваша стратэгічнае мысленне. Я гэта бачыў у Мінскай вобласці (Анатоль Ісачанка кіраваў Мінскім аблвыканкамам. — **«Зв.»**). Вы таксама вяртаецеся на сваю родную зямлю», — дадаў кіраўнік краіны.

Па яго словах, былога старшыню Магілёўскага аблвыканкама Леаніда Зайца ён парэкамендуе ў Савет Рэспублікі. Зрабіў, як заўважае Прэзідэнт, той для рэгіёна шмат, а цяпер мае праблемы са здароўем. «Леанід Канстанцінавіч і сам прапанаваў, што гатовы папрацаваць на іншай пасадзе. А так супала, што Анатоль згадзіўся паехаць у Магілёўскую вобласць», — патлумачыў ратацыю Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што новых губернатараў асабіста прадставіць у рэгіёнах, пагутарыць з дэпутацкім корпусам абласных Саветаў і актывам. «Без губернатараў краіны быць не можа. Гэта ключавыя пасады. Няма кіруючых партый, няма Кампартыі, што брала на сябе ідэалогію, кадры ды іншыя пытанні па кіраванні. Усё гэта зведзена на ўзровень губернатараў і старшынь райвыканкамаў. Гэта робіць вызначальнымі вашы пасады», — рэзюмаваў размову Прэзідэнт.

Марыя ДАДАЛКА.

• Каментарый у тэму

Ігар КАРПЕНКА расказаў, што для яго старшынства ў ЦВК было нечаканасцю, але з выбарчым працэсам ён знаёмы добра: даводзілася ў розных якасцях удзельнічаць у апошніх электаральных кампаніях.

«У сувязі са зменамі ў Канстытуцыі ў рамках рэферэндуму неабходна будзе арганізаваць работу па заканадаўчым замацаванні навацый, што з'явяцца. Старшыня ЦВК можа па-іншаму абірацца, будуць, магчыма, іншыя змены, якія запатрабуюць дакладнай прапрацоўкі з тэрыторыямі, з усімі зацікаўленымі галінамі ўлады, каб адбудаваць выбарчую сістэму адпаведным чынам», — заўважыў Ігар Карпенка.

Не адмаўляецца ён і ад працы ў Міністэрстве адукацыі — неабходна дапамагчы з кандыдатурай міністра, разабрацца з укараненнем навацый у сістэму адукацыі, якія вызначылі на апошнім рэспубліканскім педсавеце.

«Я думаю, той задзел, што зроблены, павінен спрацаваць на далейшае развіццё сістэмы. Галоўнае — не страціць тэмп, зададзены на Рэспубліканскім педагагічным савеце», — сказаў Ігар Карпенка.

Анатоль ІСАЧАНКА, старшыня Магілёўскага аблвыканкама, сцвярджае, што вобласць працуе нядрэнна, але неабходна і дзесьці актывізавацца.

«Мне будзе дапамагаць тое, што я нядрэнна ведаю Магілёўскую вобласць, шмат гадоў адпрацаваў там, знаёмы з кадрамі, менталітэтам насельніцтва, падыходамі», — падкрэсліў Анатоль Ісачанка. Ён канстатаваў, што дзяржаўная служба падобная да ваеннай. І калі ёсць прызначэнне, неабходна, не раздумваючы, на яго згаджацца і аддана працаваць.

Аляксандр СУБОЦІН, старшыня Віцебскага аблвыканкама, яшчэ раніцай збіраўся ў сераду ляцець на эканамічны форум ва Уфу, але планы нечаканым чынам змяніліся.

«Была запланавана вялікая праграма, пачынаючы ад вывучэння вопыту манціравання шпіталяў, што хутка ўзводзяцца пры заразных захворваннях, завяршаючы вывучэннем нафтаперапрацоўкі, хімічнай галіны. Планаў было шмат, але цяпер іх прыйдзецца падкарэктаваць», — падзяліўся ён.

Аляксандр Субоцін адзначыў, што немагчыма вызначыць нейкую адну сферу ў Віцебскай вобласці. Апошнія гады паказала важнасць і медыцыны, і адукацыя, і ідэалогія, і іншыя сферы.

«Неабходна і накарміць людзей. Прамысловасць — рухавік усяго, — кажа былы віцэ-прэм'ер. — Няма нічога прыярытэтнага. Усё важна, і ўсё неабходна развіваць».

«Ім патрэбна прычына ціску на Беларусь»

На мінулым тыдні Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю турэцкай тэлерадыёкампаніі TRT. Падчас размовы закранулі тэму знешняй палітыкі Беларусі, адносін з Расіяй, ЕС, мігранцкі крызіс. Падрыхтавалі для вас чарговыя падрабязнасці той размовы.

Па словах кіраўніка краіны, Турцыя — адна з самых дружалюбных для Беларусі дзяржаў, супрацоўніцтва з якой развіваецца па шэрагу напрамкаў, у тым ліку ў гандлёва-эканамічнай сферы. Прэзідэнт адзначыў, што ў яго склаліся і добрыя асабістыя адносіны з турэцкім лідарам: «Любая просьба Рэджэпа Эрдагана беспярэчна, калі гэта магчыма, выконваецца Беларуссю. Тое ж мы бачым і з боку Турцыі. Я яшчэ раз дзякую кіраўніцтву Турцыі за прынцыповую пазіцыю, за тую прыстойную пазіцыю, якую яна праводзіць у адносінах да нашай Беларусі».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў асаблівую ўвагу на тое, якім чынам Турцыя спраўляецца з вялікім патокам бежанцаў: «Магу сказаць, што вы проста гераічная краіна і ваша кіраўніцтва — самае высакароднае ў свеце. Вы ўтрымліваеце на сваёй тэрыторыі больш за чатыры мільёны бежанцаў. Гэта робіць вам гонар».

У час размовы журналіст пацікавілася перспектывамі развіцця Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі і спытала, ці будзе ў выніку гэта аб'яднанне падобнае да Еўрасаюза. «Гэты саюз будзе больш сучасны і больш стабільны, — адказаў кіраўнік дзяржавы. — Бо мы ўлічым усе памылкі Еўрапейскага саюза, каб іх не паўтараць. А станоўчы вопыт, які карысны для нас, будзем выкарыстоўваць».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што працэс інтэграцыі дзвюх дзяржаў будзе паступальны і не прывязаны да якіх-небудзь тэрмінаў.

Прэзідэнт Беларусі выказаўся і аб непрызнанні Захадам яго легітымнасці, адзначыўшы, што не просіць гэтага рабіць. «Ні ў Беларусі, ні ў Турцыі легітымнасць не мае патрэбы ў прызнанні іншых дзяржаў. Дастаткова таго, што мяне мой народ, які выбраў, лічыць легітымным, і, згодна з Канстытуцыяй Беларусі, у Беларусі сёння легітымны Прэзідэнт», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, у якім выпадку Беларусь можа перакрыць транзіт газу ў Еўропу. «Калі санкцыі, якія яны ўводзяць або ўвядуць у будучыні, паставяць нас у надзвычайнае становішча і ў нас не будзе ніякага выхаду адказаць іншымі мерамі на іх санкцыі, мы выкарыстаем і гэту жорсткую меру», — сказаў кіраўнік краіны.

Паводле яго слоў, у Беларусі нікога з бежанцаў не прымушаюць пакідаць Беларусь і вяртацца на радзіму: «Скажыце мне хоць адзін факт і назавіце таго чалавека, якога прымушаюць выехаць на радзіму, і я асабіста разбяруся з гэтым. Мы не варвары, каб гнаць людзей туды, дзе ім пагражае смерць. Людзі там не проста жыць не могуць — яны разумеюць, што, вярнуўшыся назад на радзіму, яны загінуць. Таму мы ні ў якім разе не гонім людзей назад».

У той жа час, адзначыў кіраўнік дзяржавы, бежанцам, якія знаходзяцца на беларуска-польскай граніцы, «рэкамендуюць вызначыцца са сваім далейшым лёсам».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, Еўрапейскі саюз не жадае весці перагаворы з Беларуссю па крызісе з бежанцамі. «Ім патрэбна прычына ціску на Беларусь, — заявіў беларускі Прэзідэнт. — Таму яны не ўдзельнічаюць у гэтых перагаворах. Хоць і адказныя асобы былі прызначаныя з іх боку, якія павінны былі весці з намі перагаворы. Але, напэўна, вельмі занятыя. Праблем у ЕС зараз вялікая колькасць, таму не да гэтага, як мы разумеем».

Паводле БелТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Байдэн прызнаў наступствы тарнада ў Кентукі федэральнай катастрофай

Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн задаволіў просьбу губернатара штата Кентукі Эндзі Бешыра аб прызнанні наступстваў тарнада ў рэгіёне катастрофай федэральнага ўзроўню, паведамілі мясцовыя СМІ. Серыя тарнада, што абрынуліся на штат у мінулую пятніцу, практычна ператварылі ў разваліны горад Мэйфілд і яго наваколлі. Паводле ацэнкі Бешыра, ахвярамі стыхійнага бедства могуць стаць больш за 100 чалавек. Байдэн напярэдадні аб'явіў у штаце надзвычайнае становішча, што дазволіла Агенцтву ЗША па надзвычайных сітуацыях (FEMA) аказаць дапамогу жыхарам, якія засталіся без жылля, святла і вады. Як паведамляецца на сайце FEMA, у гэтым выпадку дапамога ўрада абмяжоўваецца $5 млн, у той час як пры буйным бедстве федэральнага маштабу гэтых абмежаванняў не існуе і ўрад «выкарыстоўвае шырокі спектр федэральных праграм дапамогі прыватным асобам і грамадскай інфраструктуры». Як вядома, разбуральныя тарнада абрынуліся на шэраг амерыканскіх штатаў на мінулым тыдні. Акрамя Кентукі, аб ахвярах паведамілі таксама штаты Арканзас, Тэнэсі і Іліноис.

КНДР і Паўднёвая Карэя згодныя абвясціць аб заканчэнні Карэйскай вайны

Прэзідэнт Паўднёвай Карэі Мун Чжэ Ін заявіў, што Злучаныя Штаты, Кітай, КНДР і Рэспубліка Карэя «прынцыпова» згодныя аб'явіць аб афіцыйным заканчэнні Карэйскай вайны 1950—1953 гадоў. Аб гэтым паведаміла BBC News. Па словах Мун Чжэ Іна, перагаворы яшчэ не пачаліся з-за папярэдняй умовы Паўночнай Карэі: Пхеньян згодны сесці за стол перагавораў, калі ЗША адмовяцца ад сваёй «варожай палітыкі» ў дачыненні да КНДР. У верасні намеснік загадчыка аддзела ЦК Працоўнай партыі Карэі сястра паўночнакарэйскага лідара Кім Ё Чжон заявіла, што Пхеньян гатовы да канструктыўнага дыялогу з Сеулам адносна дэкларацыі аб афіцыйным завяршэнні Карэйскай вайны. Яна вялася з 25 чэрвеня 1950-га да 27 ліпеня 1953-га і скончылася перамір'ем. Паміж краінамі не быў заключаны мірны дагавор, і фармальна Паўночная і Паўднёвая Карэі да гэтага часу знаходзяцца ў стане вайны.

Прадстаўніца Індыі выйграла конкурс «Міс Сусвет»

Харназ Сандху стала «Міс Сусвет — 2021», паведаміла ТАСС. У фінальную частку цырымоніі пасля конкурсу купальнікаў выйшлі 10 удзельніц, у далейшым толькі пяці з іх прадстаўлялася магчымасць адказаць на пытанні журы, прысвечаныя надзённым тэмам, і наблізіцца да фіналу. Пасля гэтага этапу засталіся ўдзельніцы з Індыі, Парагвая і ПАР, якім трэба было выступіць з кароткай прамовай на пэўную тэму. Канкурсанткам прапанавалі даць параду дзяўчатам, якія вымушаны сутыкацца з ціскам у сучасным свеце. Пераможца звярнулася да маладых людзей з энергічным заклікам верыць у сябе, не параўноўваць сябе з іншымі і думаць аб важных падзеях, якія адбываюцца ў свеце. Прадстаўніца Індыі атрымала карону ад пераможцы мінулага года Андрэа Меса, родам з Мексікі. Віцэ-міс стала прадстаўніца ПАР. Усяго ў 70-м конкурсе прынялі ўдзел дзяўчаты з 80 краін.

У КРАМУ З «ДЭПУТАЦКІМ СПІСАМ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як падкрэсліў парламентарый, галоўная задача маніторынгу — супаставіць атрыманыя даныя з узроўнем даходаў жыхароў рэгіёна, каб вызначыць: наколькі рост цэн адпавядае росту даходаў грамадзян, ці дазваляе заработная плата ў канкрэтным рэгіёне набываць неабходныя прадукты харчавання, тавары і аплачваць паслугі.

На мінулым тыдні на тэрыторыі Ельскага раёна Гомельшчыны маніторынг цэн на прадукты і лекі правёў **член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Фелікс ЯШКОЎ.** Парламентарый разам з прадстаўнікамі райвыканкама і раённага Савета дэпутатаў наведаў крамы і аптэкі райцэнтра. На асаблівым кантролі сенатара — цэны ў крамах на крупы, мясныя вырабы, кансервы, малочныя прадукты і гародніну. Падчас маніторынгу цэн на прадукты харчавання член верхняй палаты парламента парушэнняў парадку цэнаўтварэння не зафіксаваў. Некаторыя тавары дадалі ў кошце нязначна, асобныя прадукты нават патаннелі.

— Выраслі цэны на мяса, але не больш чым на 0,2 %, устаноўленыя пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, — падкрэсліў у размове з журналістамі Фелікс Яшкоў. — Важна, каб пры фарміраванні цаны ўлічваліся інтарэсы ўсіх: і вытворцаў, і арганізацый, што рэалізоўваюць прадукцыю і, галоўным чынам, спажыўцоў.

Маніторынг цэн на лекавыя прэпараты ў аптэках Ельска таксама паказаў, што цэнаўтварэнне на медыкаменты ў межах дапушчальных норм. На Гомельшчыне да маніторынгу цэн на лекі ў аптэках сельскай мясцовасці актыўна далучыліся дэпутаты базавага ўзроўню і лідары раённых аб'яднанняў прафсаюзаў.

Па словах **старшыні Гомельскага раённага аб'яднання прафсаюзаў Ларысы ЛЕГЛІК,** праводзіцца выбарачнае назіранне за асартыментам і цэнамі на асобныя віды лекавых сродкаў у аптэках сеткі «Фармацыя». На кантролі — наяўнасць абавязковага пераліку лекавых прэпаратаў беларускай і расійскай вытворчасці. Лідар раённага аб'яднання прафсаюзаў патлумачыла, што цэны фіксуюцца на пэўную дату, а затым параўноўваюцца з тымі, якія былі раней. Кіраўнік Гомельскага раённага аб'яднання прафсаюзаў прывяла вынікі апошняга маніторынгу цэн на лекі ў аптэцы аграгарадка Яроміна Гомельскага раёна:

— Цэны на лекавыя прэпараты, якія мы маніторым, застаюцца адносна стабільнымі. Напрыклад, цана прэпарата «Азітраміцын Фармлэнд» (500 мг) сёння складае 17,25 рубля. Такая ж цана была зафіксавана і пры маніторынгу, які праводзіўся ў маі—чэрвені. «Анальгін» (500 мг) таксама не павысіўся ў цане — яна складае 1,4 рубля. Тая ж сітуацыя і з «Парацэтамолам» (500 мг), цана з красавіка не памянялася — 1,97. Варта адзначыць, што на некаторыя групы лекавых прэпаратаў цана нават панізілася. Пры маніторынгу ў аптэцы адсутнічаў «Амаксіцылін». Нам растлумачылі, што гэты прэпарат не паставіляўся ўжо каля двух тыдняў. Пры гэтым у дастатковай колькасці ёсць аналагі як айчыннай, так і замежнай вытворчасці.

Цэны на лекі і прадукты харчавання і іх даступнасць для жыхароў населеных пунктаў застаюцца на кантролі дэпутатаў базавага ўзроўню. На гэтым засяродзіла ўвагу **старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА:**

— Мы павінны разумець, што рост цэн ва ўмовах нестабільнасці на сусветных рынках складана спыніць, аднак гэты працэс павінен кіравацца, каб не назіралася штучнае завышэнне цэн на тавары. Рэгулярны маніторынг дазваляе трымаць сітуацыю пад кантролем, а меры, якія прымаюцца дзяржавай, робяць тавары ў крамах і лекі ў аптэках больш даступнымі для насельніцтва.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Надвор'е

На 2—7 градусаў вышэй за норму, але гэта нядоўга

У выхадныя зямлю зноў накрые снегам

Зіма ў нашай краіне пачалася строга па графіку — з першых дзён снежня. Але на другі тыдзень яе не хапіла. Да нас «зазірнула» зімовая адліга, калі ўсталяваўся тэмпературны рэжым, што стаў значна апярэджваць кліматычную норму і больш адпавядаць сярэдзіне лістапада. А таму цёплае акіянічнае паветра і ападкі ў выглядзе дажджу сталі прычынай хуткага разбурэння снежнага покрыва.

Ужо ў гэтыя дні на большай частцы тэрыторыі краіны снег амаль увесь растаў і толькі па поўначы краіны назіраецца снежнае покрыва вышынёй да 1—5 сантыметраў, на крайнім паўночным усходзе Віцебскай вобласці метэастанцыя Езярышча зарэгістравала 15 сантыметраў. У першай палове тыдня снег працягне раставаць, а бліжэй да выхадных чакаем яго зноў. Так, у пятніцу і суботу пахаладае, і да нас зноў прыйдзе зіма, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У другой палове дня ў аўторак умовы надвор'я ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску. Чакаецца воблачна з прасяненнямі. Пераважна без ападкаў, толькі месцамі па Гродзенскай вобласці — невялікі мокры снег з дажджом. У асобных раёнах туман, галалёд. На дарогах месцамі галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра на працягу сутак ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла.

А вось у сярэдзіне тыдня адаб'ецца ўплыў атмасферных франтоў і цёплай паветранай масы, якая распаўсюджваецца з боку Балтыйскага мора. У сераду чакаецца воблачна з прасяненнямі. Уначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень месцамі па краіне ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёва-заходні, заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы ад нуля да мінус 5 градусаў, пры прасяненнях да 8 марозу, удзень — ад 2 марозу да 3 цяпла.

Не зусім зімовае надвор'е ўсталюецца і ў чацвер. У гэты дзень будзе пераважаць воблачнае надвор'е, часам з ападкамі, у асноўным дождж. Месцамі туман, уначы і раніцай слабы галалёд. Вецер заходняй чвэрці ўмераны, па паўночнай палове парывісты. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла, удзень —1—6 градусаў вышэй за нуль.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу і на выхадныя на тэрыторыю нашай краіны пачне паступаць больш халодная паветраная маса. Менавіта ў пятніцу на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя ападкі будуць ісці ўжо ў выглядзе мокрага снегу. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўднёвы, з пераходам на паўночна-заходні ўмераны. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла.

У суботу чакаецца пераменная воблачнасць і больш зімовае надвор'е. Месцамі па краіне пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег, слабая завіруха. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўночны з пераходам на заходні ўмераны. Тэмпература паветра мінімальная ўначы ад нуля да мінус 7 градусаў, максімальная ўдзень ад 4 марозу да 2 цяпла. Слабаадмоўнае надвор'е чакаецца і ў нядзелю. Будзе ісці снег, а ў асобных раёнах слабы туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца.

Сяргей КУРКАЧ.

Дзеля памяці

Зоркавы след Міхаіла Фінберга

Фота БелТА.

«Маэстра стаў сімвалам цэлай эпохі ў эстрадным мастацтве. Без астатку аддаваў сябе музыцы і гледачу. Чалавек вялізнага педагагічнага таленту выхаваў не адно пакаленне папулярных маладых выканаўцаў», — гаворыцца ў спачуванні, якое родным і блізкім Міхаіла Фінберга накіраваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сваім шматгадовым самаадданым служэннем на ніве айчыннай культуры Міхаіл Фінберг заслужыў сапраўдную павагу калег і народную любоў.

«Міхаіл Якаўлевіч — прыклад бязмежнай адданасці мастацтву і Радзіме. Светлая памяць аб ім назаўжды захаваецца ў нашых сэрцах», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Можна нават не пералічваць званні, пасады, можна нават не пераказваць жыццёвы і творчы шлях... Яго, апантанага, захопленага музыкай чалавека, ведае ўся Беларусь. Яго ведае свет эстрады і ўсёй постсавецкай прасторы...

Хлапчук з Мазыра, які неаднойчы падкрэсліваў, што беларускай мове вучыўся па найстарэйшай у краіне газеце «Звязда», ён вызначаўся тактам, цікаўнасцю да ўсіх абсягаў культуры. Здавалася, што ён сваімі сіламі, сваім мастацкім талентам хацеў ахапіць усю Беларусь. Яркі музычны талент спалучаўся ў ім з талентам арганізатара, кіраўніка...

У 1970-м ён у 23 гады скончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па спецыяльнасці «дырыжор». А яшчэ праз тры гады — аспірантуру пры кансерваторыі. Званне прафесара Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі дадзена яму, колішняму выхаванцу ваеннага аркестра штаба Беларускай ваеннай акругі (1962—1966), зусім невыпадкова... У 1970—1987 гадах Міхаіл Якаўлевіч — дырыжор, галоўны дырыжор аркестра Мінскага дзяржаўнага цырка. З 1987-га — мастацкі кіраўнік — дырэктар Дзяржаўнага аркестра Рэспублікі Беларусь (цяпер — Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Рэспублікі Беларусь).

Сярод узнагарод Міхаіла Якаўлевіча — ордэн Францыска Скарыны, якім творца адзначаны «за значны асабісты ўнёсак у развіццё нацыянальнай культуры, захаванне і прапаганду найлепшых музычных традыцый». Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, народны артыст Беларусі, лаўрэат прэміі Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне культуры і мастацтва, за канцэртныя праграмы першай паловы 1990-х ён быў адзначаны і Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь. Пералік прэмій і іншых узнагарод Міхаіла Фінберга можна, здаецца, доўжыць яшчэ і яшчэ. І калі аглядаешся на яго, дырыжора Міхаіла Фінберга, якому ў 2022 годзе павінна было б споўніцца 75 гадоў, неўпрыкмет задумваешся, а хто ж падхопіць яго справу... Хто з такой, выключна фінбергаўскай, павагай атуліць маладых выканаўцаў, хто праедзе з імі па гарадах, часам самых невялікіх паселішчах Беларусі? Хто створыць новыя, бліскучыя, запамінальныя праграмы аркестра на словы беларускіх паэтаў — найперш класікаў?..

Міхаіл Фінберг, ганаровы грамадзянін Нясвіжа, Мазыра, ганаровы грамадзянін Мінскай вобласці, — чалавек, якому было шмат дадзена пры жыцці. Дадзена дзякуючы яго высокаму таленту чуць Словы і Музыку... Будзем верыць, што доўга яго імя будзе захоўвацца ва ўмоўным пантэоне вялікіх грамадзян Беларусі. І што следам за ім захавальнікамі багатай музычнай культуры нашай Айчыны будуць не менш таленавітыя наступнікі.

Светлая памяць...

Кастусь ЛАДУЦЬКА.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю ФІНБЕРГА Міхаіла Якаўлевіча, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга склікання, дырэктара — мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі, народнага артыста Беларусі, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю БРЫГАДЗІНА Пятра Іванавіча, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання, дырэктара Інстытута бізнесу БДУ, заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі Беларусь, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

Тэхналогіі

НАВОШТА БЕЛАРУСІ ДАСЛЕДЧЫ ЯДЗЕРНЫ РЭАКТАР

Мэта атамнай электрастанцыі дакладная — забяспечваць краіну электраэнергіяй. А вось магчымасці даследчага рэактара больш шырокія: вывучаць новыя віды ядзернага паліва, напрацоўваць ізатопы, змяняць уласцівасці матэрыялаў і іншае. Яго наяўнасць шматразова павялічвае станоўчы эфект прысутнасці атамнай галіны ў краіне, упэўнены эксперты.

Фота прэс-службы Дзяржкамітэта «Расатам».

Уласны даследчы ядзерны рэактар дазволіць Беларусі ўкараняць перадавыя тэхналогіі ў прамысловасці, медыцыне, навуцы, сельскай гаспадарцы, а таксама пасадзейнічае практычнай падрыхтоўцы кадраў для атамнай галіны, упэўнены ў Аб'яднаным інстытуце энергетычных і ядзерных даследаванняў — Сосны.

Вопыт правядзення ядзерных даследаванняў, прынамсі, вядзецца ў Беларусі яшчэ з савецкіх часоў, калі ў інстытуце Сосны вялася фундаментальныя работы. Даследаванні працягваюцца і зараз, а з будаўніцтвам АЭС яны набылі больш прыкладны характар.

— Для рашэння задач, якія стаяць перад навукай Беларусі, неабходна адэкватная навукова-вытворчая база з даследчым ядзерным рэактарам, — упэўнены **генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў — Сосны Андрэй КУЗЬМІН.** — Гэтае пытанне Беларусь зможа вырашыць, рэалізаваўшы праект па будаўніцтве даследчага рэактара сумесна з Дзяржкарпарацыяй «Расатам», што стане важным крокам на шляху фарміравання адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы Беларусі і Расіі ў галіне выкарыстання атамнай энергіі.

Прыклад работы такога даследчага рэактара — вучэбна-навуковы цэнтр «Даследчы ядзерны рэактар» Томскага політэхнічнага ўніверсітэта, дзе штогод навучаецца больш за 400 студэнтаў. Як паказала практыка, навучанне на дзейным даследчым рэактары дазваляе істотна пашырыць спектр кампетэнцый спецыялістаў.

— Ядзерны рэактар у сукупнасці са спадарожнымі ўстаноўкамі — гэта, па сутнасці, сучасны Цэнтр ядзернай навукі і тэхналогій, які дазваляе засяродзіць у адным месцы ўсе кампетэнцыі краіны ў галіне ядзернай навукі, адукацыі, радыяцыйных тэхналогій, — адзначыла **кіраўнік міжнародных ядзерных адукацыйных праграм Томскага політэхнічнага ўніверсітэта Вера ВЕРХАТУРАВА.**

«Расатам» гатовы прапанаваць сваім міжнародным партнёрам будаўніцтва падобнага цэнтра з шырокім функцыяналам, запэўніў **віцэ-прэзідэнт па праектах даследчых рэактараў і цэнтраў ядзернай навукі і тэхналогій «Русатам Аверсіз» Дзмітрый ВЫСОЦКІ:**

— Пры гэтым выбар канчатковага складу аб'ектаў будучага цэнтра залежыць ад бягучых патрэб заказчыка і яго планаў па развіцці навукова-даследчых кампетэнцый краіны.

Немалаважна, што даследчыя рэактары шырока выкарыстоўваюцца не толькі для навуковай дзейнасці, але і для вытворчасці камерцыйнай прадукцыі. Гэта, напрыклад, напрацоўка ізатопаў медыцынскага ці прамысловага прызначэння або ядзерна-легіраванага крэмнію для электроннай прамысловасці, электрамабіляў, а таксама накапленне і перадачы току ад сонечных панэляў і ветрагенератараў.

Ірына СІДАРОК.

Будзь у курсе!

ЦЯГНІКІ КУРСІРУЮЦЬ ПА НОВЫМ ГРАФІКУ

Беларускай чыгункай уведзены ў дзеянне графік руху цягнікоў на 2021—2022 гады. Ён сфарміраваны на падставе маніторынгу попыту на перавозкі, напрамкаў пераважных пасажырапатокаў, а таксама выканання патрабаванняў сістэмы дзяржаўных сацыяльных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва ў галіне транспарту. З улікам гэтага, а таксама ў выніку праведзенай сумеснай работы з аблвыканкамамі па аптымізацыі памераў руху на малаінтэнсіўных участках і арганізацыі рэгулярных аўтамабільных перавозак, у новым графіку прадугледжана курсіраванне 272 пар цягнікоў рэгіянальнага эканом-класа. Пра гэта інфармуе прэс-цэнтр магістралі.

Асаблівая ўвага пры фарміраванні новага графіка была ўдзелена развіццю і ўмацаванне транспартных сувязяў рэгіёнаў краіны, у тым ліку за кошт планавай рэалізацыі інфраструктурных праектаў і паступлення новага рухомага саставу.

Так, у міжрэгіянальных зносінах бізнес-класа з улікам задзейнічання новых пяцівагонных электрацягнікоў ЭПМ з больш высокімі спажывецкімі якасцямі прадугледжана іх курсіраванне на такіх запатрабаваных напрамках, як Мінск — Гомель і Мінск — Брэст. Гэты рухомы састаў будзе абслугоўваць цягнікі № 701/702 Мінск — Брэст, № 715, 716, 739, 747, 748 Мінск — Гомель. Пры гэтым вызвалены рухомы састаў ЭПР будзе задзейнічаны ў абслугоўванні маршрутаў цягнікоў міжрэгіянальных і рэгіянальных ліній бізнес-класа.

Адной з навін графіка руху на 2021/2022 гады з'яўляецца павелічэнне памераў руху міжрэгіянальных ліній бізнес-класа ў зносінах Мінск — Гомель па перадвыхадных, выхадных і святочных днях. Так, новы цягнік № 756 Мінск — Гомель будзе адпраўляцца з Мінска ў 19.36 прыбыццём у Гомель у 23.18 (па пятніцах, суботах і нядзелях) з прыпынкамі на станцыях «Пухавічы», «Асіповічы», «Бабруйск», «Жлобін» і «Буда-Кашалёўская». У зваротным напрамку цягнік № 755 Гомель — Мінск будзе адпраўляцца з горада над Сожам у 4.43 і прыбываць у Мінск у 7.53 (у суботу, нядзелю і панядзелак) з такімі ж прыпынкамі.

Пашырэнне маршрутнай сеткі закранула і рэгіянальныя лініі бізнес-класа за кошт прадаўжэння маршруту Мінск — Светлагорск да Калінкавіч (пасля заканчэння электрыфікацыі ўчастка Светлагорск — Калінкавічы) і арганізацыі маршруту Мінск — Жлобін. Таксама будзе павялічана колькасць месцаў у цягніках рэгіянальных ліній бізнес-класа Мінск — Орша за кошт задзейнічання рухомага саставу ЭПР у пяцівагонным выкананні.

Да фарміравання маршрутнай сеткі ў рамках Саюзнай дзяржавы чыгуначныя адміністрацыі дзвюх краін падышлі з улікам патрэбнасці насельніцтва ў цягніках у дзённы ці ў начны час, а таксама далёкасці паездкі. З 12 снежня прадугледжваецца захаванне маршрутаў на пасажыраўтваральных напрамках, такіх як Масква, Санкт-Пецярбург, Адлер, у тым ліку з арганізацыяй шматгрупных цягнікоў. Цяпер Беларуская чыгунка прадаўжае работу з ААТ «Расійскія чыгункі» па прызначэнні цягнікоў да Мурманска, Архангельска, Анапы, Мінеральных Водаў і Кіславодска.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Спажывец

Каму жывы зімовы сімвал?

Першыя ёлачныя кірмашы адкрыюцца ў Беларусі з 18 снежня. Гандляваць пухнатымі святочнымі атрыбутамі раней за іншых пачнуць у асобных рэгіёнах Брэсцкай вобласці. Пра гэта інфармуе Міністэрства лясной гаспадаркі.

З 20 снежня ёлачныя кірмашы пачнуць адкрывацца ў Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцях, з 21 снежня — у Магілёўскай, з 22 снежня — у Гомельскай і ў Мінску.

Традыцыйна ў сталіцы будуць працаваць два пункты ад дзяржаўных устаноў: вул. Багратыёна, 70 і вул. Прытыцкага, 146. У іншых месцах у Мінску будуць гандляваць індывідуальныя прадпрымальнікі.

Адрасы і рэжым працы ёлачных кірмашоў у рэгіёнах хутка з'явяцца на сайтах лесагаспадарчых устаноў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Сугучча

Амар Хаям на мове Купалы

У Пасольстве Ірана абмяркоўвалі тэмы культурнага і кнігавыдавецкага супрацоўніцтва

У Пасольстве Ісламскай Рэспублікі Іран у Мінску адбылася сустрэча кіраўніка дыпламатычнай місіі з дырэктарам — галоўным рэдактарам Выдавецкага дома «Звязда», галоўным рэдактарам урадавай і парламенцкай газеты «Звязда» Аляксандрам Карлюкевічам.

— Маё знаёмства з Беларуссю паказала, якая багатая ў вашай краіне нацыянальная культура, — зазначыў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ірана ў Рэспубліцы Іран Саід ЯРЫ.** — Я ўжо пабываў у такіх гістарычных цэнтрах, як Нясвіж і Мір. Музейныя комплексы ў гэтых мясцінах мяне надзвычай уразілі. Цяпер збіраюся наведацца ў Брэсцкую крэпасць. Хацелася б пазнаёміць беларусаў і з нашай іранскай культурай.

Размова на сустрэчы ў пасольстве ішла і пра выданне кнігі класіка ўсходняй паэзіі Амара Хаяма ў перакладзе на беларускую мову. Аляксандр Карлюкевіч расказаў пра першыя напрацоўкі ў гэтым напрамку. Вершы класіка ўжо часткова пераўвасоблены на мову Купалы. Раней гэтай перакладчыцкай працай займаўся народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін. Зараз да беларускага прачытання спадчыны Амара Хаяма падключыўся лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі паэт Віктар Шніп. Кніга павінна пабачыць свет у пярэдадзень чарговай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу ў Мінску.

Спадар Саід Яры прапанаваў для рэалізацыі і яшчэ адну ідэю, выказаўшы прапанову далучыць да гэтага клопату і беларускую амбасаду ў Іране: выдаць кнігу вершаў беларускіх класікаў — Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча ў перакладзе на фарсі. Размова ішла пра тое, што добра было б рэалізаваць гэты праект да 30-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносін Беларусі і Ірана, якое краіны будуць адзначаць у 2023 годзе.

Мікола БЕРЛЕЖ.

КАЛЯДНЫ ОПЕРНЫ ФОРУМ: ПРЭМ'ЕРЫ І ЗОРНЫЯ ІМЁНЫ

З 14 да 22 снежня ў сталіцы пройдзе XI Мінскі міжнародны Калядны форум. Месца сустрэчы нязменнае — Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі. Сёлета наведвальнікаў чакае цікавая праграма: прэм'еры спектакляў бягучага сезона, вядомыя госці з Расіі, Азербайджана, Грузіі і Італіі, а галоўнае, атмасфера сапраўднага цуду, што дорыць мастацтва.

Старт насычанаму святочнаму тыдню дасць 14 снежня паказ прэм'еры оперы «Самсон і Даліла», рэжысёрам-пастаноўшчыкам якой выступіла заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Аксана Волкава.

А 18 снежня на сцэне — опера «Фаўст» Шарля Гуно ў пастаноўцы рэжысёра Ганны Маторнай. На наступны дзень, 19 снежня, увазе публікі прадставіць яшчэ адну прэм'еру мінулага года — оперу «Вілісы. Фатум» Джакома Пучыні. Дадзеная пастаноўка стала першым прачытаннем твора ў беларускім тэатры, і ў ёй дэбютавала ў якасці рэжысёра Аксана Волкава.

Прыхільнікам опернага мастацтва па матывах айчыннай класікі варта не прапусціць пастаноўку 21 снежня. У гэты дзень у Вялікім пакажуць оперу «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Солтана. Новую рэдакцыю оперы па матывах дэтэктыўнай аповесці Уладзіміра Караткевіча здзейсніла рэжысёр Ганна Маторная.

Акрамя спектакляў, у праграме форуму заяўлены і два вялікія канцэрты. Так, 17 снежня пройдзе сольны канцэрт зоркі сусветнай оперы Кацярыны Семянчук. Завяршальным стане 22 снежня гала-канцэрт зорак сусветнай оперы. У праграме возьмуць удзел артысты беларускай оперы і госці форуму Уладзіслаў Сулімскі, Кацярына Семянчук, Магерам Гусейнаў, зорка маскоўскага Вялікага тэатра Венера Гімадзіева, а таксама артыст Марыінскага і Вялікага тэатра Расіі Годэрдзі Джанелідзэ. За рэжысёрскім пультам у гэты вечар будзем вітаць Джанлуку Марчана, мастацкага кіраўніка фестываляў «Аль-Бустан» у Бейруце (Ліван) і Suoni dal Golfo ў Лерычы (Італія).

Алена ДРАПКО.

На свае вочы

«Гэты Палац напоўнены Беларуссю»

Выкладчыкі ГрДУ імя Янкі Купалы наведалі Палац Незалежнасці

Чарговая экскурсія па рэзідэнцыі Прэзідэнта Беларусі адбылася ў суботу для калектыву Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Група досыць вялікая — 55 чалавек.

Упершыню ў Палац Незалежнасці прадстаўнікі гэтага ўніверсітэта былі запрошаны Аляксандрам Лукашэнкам пасля яго сустрэчы са студэнтамі ў 2018 годзе. У мінулую суботу, як адзначыла **рэктар ВНУ Ірына КІТУРКА,** у Мінск прыехалі менавіта тыя, хто працуе з моладдзю, — выкладчыкі, прадстаўнікі кіраўніцтва.

«Мы памятаем педагагічны савет. На ім за вучэбную дзейнасць кіраўнік краіны паставіў нам «дзесяць», а выхаваўчую сказаў аціліць самім. І мы зразумелі, што выхаваўчая дзейнасць да «дзясятку» не дацягвае. Таму сёння тут тыя, хто непасрэдна працуе са студэнтамі», — расказала рэктар.

Ірына Кітурка заўважыла: сама ўжо была ў Палацы Незалежнасці. Пасля першага наведвання яе ўражанні ўвасобіліся ў выраз, які яна напярэдадні візіту сказала сваім калегам: «Гэты Палац напоўнены Беларуссю».

Кіраўнік ВНУ адзначае: асабліва грэе тое, што ў Палацы Незалежнасці ёсць часцінка ГрДУ. Пры першым візіце сюды студэнты падарылі ў калекцыю ікону Святога Мікалая, створаную рукамі выпускніцы Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. З падарункам прыехалі і выкладчыкі.

«Мы прывезлі набор ёлачных цацак, зробленых з дрэва. Яны асаблівыя, бо кожная з іх — пэўны архітэктурны помнік горада Гродна. Цацкі зроблены выкладчыкамі і вучнямі гуманітарнага каледжа, які ўваходзіць у структуру нашага ўніверсітэта», — расказала Ірына Кітурка.

Экскурсію для гасцей правяла па традыцыі **прэс-сакратар Прэзідэнта Наталля ЭЙСМАНТ.** Яна адзначыла, што Палац Незалежнасці заўсёды з асаблівай цеплынёй прымае экскурсантаў з рэгіёнаў Беларусі. Па яе словах, апошнім часам да наведвання будынка асаблівы ажыятаж.

«Народная сцежка не зарастае. Нашу сустрэчу пакажуць у сродках масавай інфармацыі, і колькасць запытаў вырасце яшчэ. І гэта вельмі прыемна, бо нам важна, каб тут пабывала як мага больш людзей», — сцвярджае Наталля Эйсмант.

Марыя ДАДАЛКА.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Моцныя рэгіёнамі

«З-за здрадніцтва ў нашай гісторыі адбываліся найбольш жудасныя падзеі»

Так лічыць старшыня Іўеўскага райвыканкама Ігар ГЕНЕЦ

Нягледзячы на тое, што пасаду кіраўніка раёна займае адносна нядаўна, Іўеўшчына для яго добра знаёмая. Справа ў тым, што ў свой час Ігар Мікалаевіч узначальваў раённы аддзел унутраных спраў. Таму калі пасля звальнення ў запас палкоўніка міліцыі, які прысвяціў службе больш як 30 гадоў, прызначылі старшынёй Іўеўскага райвыканкама, ён выдатна ўяўляў, якімі праблемамі жыве рэгіён і што трэба зрабіць, каб ён развіваўся. З цікавасцю ўзяўся за даручаную справу яшчэ і з той прычыны, што раён, на яго погляд, незвычайны.

— Ігар Мікалаевіч, чым жа Іўеўшчына адрозніваецца ад астатніх раённых цэнтраў?

— Ужо хоць бы тым, што ў Іўі знаходзіцца самая старая мячэць краіны: 1882 года пабудовы. Для таго каб зразумець горад, абавязкова трэба там пабываць, а таксама наведаць Музей нацыянальных культур, які таксама адзіны такі на ўсю краіну. У якім яшчэ беларускім горадзе, пачынаючы з XIV стагоддзя, жывуць татары? Сёння татарская абшчына Іўеўскага раёна складае каля 800 чалавек. Іўе — гэта яшчэ і каталіцкі рэгіён: амаль 80 % насельніцтва з'яўляецца каталікамі. Ёсць у нас і праваслаўныя жыхары, аб чым сведчаць прыгожыя цэрквы. Аднак колькасць касцёлаў у некалькі разоў большая. Самы знакаміты — касцёл у Геранёнах 1520 года пабудовы. Гэта нашы гісторыка-культурныя каштоўнасці, якімі мы ганарымся. Невыпадкова, каб яшчэ раз спазнаць Іўеўшчыну і адкрыць яе для маладых спецыялістаў, сёлета знаёмства апошніх з кіраўніцтвам мы аб'ядналі з экскурсіяй па нашым рэгіёне. Атрымалася ці не ўлюбіць іх у горад, скажам праз два гады. Калі адпрацуюць па размеркаванні і застануцца — значыць, атрымалася, калі з'едуць — гэта наша недапрацоўка.

— Увогуле, ці ахвотна маладыя спецыялісты едуць у рэгіён, ці застаюцца пасля адпрацоўкі па размеркаванні?

— Гэта дастаткова праблемнае для нас пытанне. Што ў першую чаргу патрэбна, каб заставалася моладзь? Жыллё. Гэта найбольш актуальны стрымальны фактар. З наступнага года мы залажылі ў інвестпраграму бюджэтныя сродкі для будаўніцтва жылля. З даху над галавой пачынаецца любоў да свайго краю. Гарадок маленькі, але ўсе адзначаюць даступнасць медыцыны: пасля рамонту ў Іўі адкрылася вельмі добрая бальніца. Магчыма, моладзь не задавальняе недасканаласць гарадской інфраструктуры: у нас няма вялікай спартыўнай пляцоўкі, фізкультурна-аздараўленчага комплексу, басейна. Гэта ў планах. Затое ёсць тое, чаго сабе не могуць дазволіць сталічныя жыхары, — вольны час. Жыхары малых гарадоў, будучы ў Мінску, імкнуцца ўбачыць славутасці, наведаць аб'екты культуры часцей, чым жыхары сталіцы, якія толькі на дарогу марнуюць нямала часу. У нас жа ўсё — у крокавай даступнасці. Такая спецыфіка рэгіёна. Самае галоўнае — яго палюбіць.

— А яшчэ Іўеўшчына ўнікальная сваёй шматканфесійнасцю. Прадстаўнікі якіх рэлігій тут пражываюць і ці не ўзнікае міжканфесіянальных канфліктаў?

— Праваслаўныя, каталікі і мусульмане. Да Вялікай Айчыннай вайны былі яшчэ і іудзеі. Нам няма чаго дзяліць. Шмат вякоў прадстаўнікі розных канфесій жылі на адной тэрыторыі, і ў гісторыі няма ніводнага прыкладу, каб на нацыянальнай глебе на Іўешчыне адбыўся пэўны канфлікт. Мы ведаем усе рэлігійныя святы адзін аднаго, паважаем традыцыі кожнага. Падчас буйных рэлігійных свят у тым ці іншым храме прысутнічаюць святары ўсіх канфесій.

— У горадзе няма вялікіх прамысловых прадпрыемстваў. Дзе працаўладкавана асноўная колькасць насельніцтва?

— Насельніцтва ў нас самазанятае. Акурат у гэтым — яшчэ адна спецыфіка раёна. На Іўеўшчыне вельмі працавіты народ: у нас шмат індывідуальных прадпрымальнікаў, рамеснікаў, фермераў. Спецыфіка прыватнага бізнесу — партнёрства з дзяржавай. 92 % бюджэту раёна фарміруе прыватная прамысловасць. Іўе даўно ведаюць як «памідорную сталіцу»: большая частка насельніцтва вырошчвае памідоры. У нас у жніўні нават ладзіцца памідорны фестываль, які абяцаў наведаць кіраўнік дзяржавы.

— У рэгіёне шмат увагі ўдзяляецца захаванню памяці аб падзеях Другой сусветнай. Асабліва гэта актуальна ў кантэксце распачатай Генеральнай пракуратурай крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд...

— У нас ва ўрочышчы Стоневічы нядаўна адбылася дыялогавая пляцоўка, якую мы невыпадкова арганізавалі не ў цёплым утульным кабінеце, а на месцы масавага знішчэння мірных жыхароў. Да вайны Іўе з'яўлялася яўрэйскім паселішчам. У Стоневічах гітлераўцы знішчылі больш чым 2500 яўрэяў. Сёлета было ўстаноўлена месца гібелі яшчэ 48 яўрэяў з вёскі Бакшты, якіх карнікі з 118-га нацыяналістычнага батальёна знайшлі ў зямлянках на балоце, закідаўшы гранатамі. Мне ўдалося азнаёміцца з матэрыяламі справы, і я хачу сказаць, што гэта была жудасная карціна. Месцазнаходжанне сваіх аднавяскоўцаў карнікам выдаў мясцовы жыхар. Узамен на інфармацыю яны абяцалі яму жыццё. З-за здрадніцтва аднаго чалавека загінулі ўсе. Лёс здраднікa адрозніваўся ад усіх астатніх толькі тым, што яго застрэлілі апошнім. Я вельмі хацеў бы, каб мы, беларусы, вынеслі для сябе ўрок: віной многіх бед з'яўляецца здрадніцтва. Гэта самы страшны грэх, з-за якога ў нашай гісторыі адбываліся найбольш жудасныя падзеі. На жаль, шмат гадоў таму, калі спрабавалі жыць у дружбе і згодзе з іншымі народамі вялікай савецкай дзяржавы, многія рэчы мы проста замоўчвалі. І цяпер высветлілася, што маштаб трагедыі значна большы, чым мы яго сабе ўяўлялі.

— Ці будзе нядаўна выяўленае месца масавага знішчэння мірных жыхароў увекавечана?

— Даехаць да месца трагедыі сёння амаль немагчыма: яно знаходзіцца сярод балот у Налібоцкай пушчы. Можна дабрацца толькі зімой, калі добры мароз. Калі б не здраднік, гэтых людзей немцы ніколі б не знайшлі... Абмеркаваўшы з грамадскасцю, у Стоневічах мы дадаткова ўстанавілі помнік, на якім пазначаны каардынаты месца гібелі гэтых 48 чалавек. У 1973 годзе па дадзеным факце вялося расследаванне. Праводзіліся раскопкі, астанкі людзей перапахавалі: куды канкрэтна, нідзе не зафіксавана. Дарэчы, падчас расследавання былі ўстаноўлены асобы карнікаў 118-га батальёна, якія мелі дачыненне да забойства мірных жыхароў. З матэрыялаў справы вядома, што пасля сваіх чорных спраў яны трапілі ў Францыю, выявілі разам з французамі супраць сваіх былых гаспадароў, многія з іх атрымалі ўзнагароды і дажывалі свой век як удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Калі ж іх дачыненне да масавага забойства ўстанавілі, частку здраднікаў расстралялі, астатнія атрымалі вялікія тэрміны. Аднак зноў жа гэта прайшло амаль незаўважаным, вялікага грамадскага рэзанансу не было: мы не хацелі зняважыць нашых братоў па вялікай краіне.

— У вас ёсць уласная рубрыка ў мясцовай газеце, дзе вы адказваеце на пытанні жыхароў. Наколькі важна сёння быць заўсёды на сувязі з народам?

— Гэта заўсёды было важна. Усе мы — звычайныя людзі. І вельмі важна, каб чыноўнік адчуваў сябе звычайным чалавекам, адкрытым для дыялогу. У жыцці любога з нас, у тым ліку таго, хто знаходзіцца на дзяржаўнай службе, павінны быць пэўныя прынцыпы работы. І прынцып «стаўся да людзей так, як хочаш, каб яны адносіліся да цябе» вельмі добра дзейнічае. Таксама неабходна бачыць кожнага чалавека. У той жа час нельга быць на пабягушках у скаржнікаў. На жаль, такое таксама ёсць. Кожная неаб'ектыўная скарга, якая пацягнула вялікія затраты дзяржавы, павінна кампенсавацца за кошт таго, хто спрабуе такім чынам расхістаць работу дзяржаўнага органа.

Вераніка КАНЮТА.

ВЫЙСЦІ З «ЧЫРВОНАЙ» ЗОНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сапраўды, сёння ў калідорах круглянскай бальніцы адносна ціха. Адзін чалавек сядзеў пад дзвярыма кабінета ўрача агульнай практыкі, двое дзяцей з бацькамі — у педыятрычным аддзяленні. Але нядаўна ўсё было па-іншаму. Аддзяленняў тут усяго чатыры — рэанімацыйнае, хірургічнае, тэрапеўтычнае і педыятрычнае. Падчас пад'ёму захворвання на кавід выкарыстоўвалі стары будынак інфекцыйнай бальніцы, дзе на другім паверсе знаходзілася тэрапеўтычнае аддзяленне. Яго аператыўна перапрафілявалі пад інфекцыйнае. «Ковідныя» ложкі былі і ў іншых аддзяленнях. Яшчэ нядаўна ў бальнічным стацыянары знаходзілася да 55 чалавек з каранавіруснай пнеўманіяй.

— Гэта вельмі вялікая для нас лічба, — удакладняе **намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы Святлана ІВАНОВА.** — У нас раён маленькі — 13,5 тысячы насельніцтва, таму і бальніца невялічкая — усяго 105 ложкаў, 20 з якіх з ліку сястрынскага догляду. І ўявіце сабе, што большая частка ложкаў была аддадзена пад хворых на каранавірус. Гэта сур'ёзна.

З меркаваннем, што добрыя медыцынскія ўмовы ствараюцца толькі ў буйных гарадах, у Круглым могуць паспрачацца. Толькі на працягу апошняга года бальніцу аснасцілі дадатковымі кіслародными канцэнтратарамі і пунктамі, у рэанімацыйнае аддзяленне перадалі два маніторы, выдзелілі новую машыну, каб аператыўна дастаўляць пацыентаў. Бальніца ўдзельнічае ў грантавым праекце «Карані травы», у рамках якога Японія выдзяляе медтэхніку для прафілактыкі захворванняў у людзей, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС. У Круглянскім раёне хапае перасяленцаў з чарнобыльскіх раёнаў, таго ж Слаўгарадскага.

У іх часцей за ўсё выяўляюцца парушэнні ў рабоце шчытападобнай залозы. «Спадзяёмся атрымаць УГД-апарат і больш аператыўна дыягнаставаць хваробу», — дадае начмед. Што датычыцца ўрачоў раённай бальніцы, то яны не менш адказныя, чым у гарадах, а часам яшчэ і больш душэўныя. Па-першае, пацыентаў меней, па-другое, у невялічкім населеным пункце ўсе адно аднаго добра ведаюць, таму адказнасць двайная. Дарэчы, з болей чым 300 чалавек, якія працуюць у бальніцы, 30 — урачы.

— І кожны незаменны, — запэўнівае Святлана Уладзіміраўна. — Любому можна даверыцца. Ніхто не скардзіцца, калі трэба выйсці тэрмінова і дадаткова папрацаваць. Яны ведаюць, што замяніць іх няма кім, і ніколі не адмаўляюцца. Тыя ж рэаніматолаг і хірург, калі паступае цяжкі хворы, выйдуць ноччу, каб стабілізаваць яго стан, а раніцай на сваю змену заступяць. На наступную ноч іх таксама могуць выклікаць. Таму мы стараемся дзесьці падстрахоўваць адно аднаго і прыйсці на ўзаемавыручку. Калі нехта з вузкіх спецыялістаў ідзе ў адпачынак, яго замяняе ўрач агульнай практыкі.

З ковіднымі хворымі працавалі амаль усе ўрачы, не лічачы сярэдняга персаналу. Быў час, калі пацыентаў з гэтым дыягназам вазілі ў шклоўскую ЦРБ і ў Магілёў. Асноўная нагрузка — на тэрапеўтычным аддзяленні, якое ўзначальвае Вікторыя Бяганская, і рэанімацыйным, якім кіруе Святлана Шахматава. Не менш напружана працавалі маладыя ўрачы Анастасія Смалякова, Марыя Букрэева, Вікторыя Аксёнава.

Каранавірус — хвароба непрадказальная, былі і вельмі цяжкія выпадкі. Урачы, лічы, выцягнулі з таго свету 40-гадовую жанчыну, маці пяцярых дзяцей. Жанчына, дарэчы, была не прышчэпленая.

— Калолі супрацьвірусныя прэпараты, трымалі ў прон-пазіцыі, падтрымлівалі маральна, — расказвае падрабязнасці суразмоўца. — Яна ў нас лячылася амаль тры тыдні. Ледзь атрымалася стабілізаваць. Мы перажываем за кожнага пацыента. Кажуць, што ўрачы да ўсяго прывыкаюць, нават да смерці, гэта няпраўда. Калі бачыш, што пацыент цяжкі, робіш усё магчымае і немагчымае. А гэта пацыентка была яшчэ і з групы рызыкі: дыябет, плюс павышаная вага. Родныя за яе вельмі перажывалі, і асабліва дзеці. Вельмі хваляваліся за маці. Мы супакойвалі як маглі. І вельмі рады, што жанчына атрымалася дапамагчы.

За апошні год штат папоўніўся маладымі спецыялістамі, якія добра зарэкамендавалі сябе ў рабоце. «Педыятр Таццяна Абаканоўіч, оталарынголаг Марыя Букрэева, урач агульнай практыкі Ірына Дзегцярова, тэрапеўт Ангеліна Падзіракіна, — пералічвае імёны начмед. — Некаторыя з іх працавалі і ў «чырвонай» зоне. Вельмі адказныя спецыялісты».

Год таму бальніцу ўзначаліў малады ўрач Максім Бяганскі. Прыехаў у раён разам з жонкай і чатырохгадовай дачкой. Нядаўна райвыканкам выдзеліў ім арэндное жыллё, і кіраўнік бальніцы ўзяў два тыдні, каб навесці там парадак.

— 11 снежня ў яго быў дзень нараджэння, напішыце, што ўвесь наш калектыў ад усёй душы віншуе яго, — просіць Святлана Уладзіміраўна. — Мы вельмі рады, калі ў нас замацоўваецца моладзь. Я ж сама таксама 20 гадоў таму сюды маладым спецыялістам прыехала. Хоць і гараджанка, з Магілёва.

Начмед пераканана, што лепшай абароны ад каранавіруса, чым прышчэпка, на сёння няма. На 8 снежня ў Круглянскім раёне першую прышчэпку зрабіла каля 57 % насельніцтва без уліку дзяцей, другую — каля 49 %.

— У асноўным прышчэпліваліся моладзь і найбольш арганізаваныя жыхары. Пенсіянеры лічаць, што адсядзяцца дома і хвароба пройдзе міма, — кажа Святлана Уладзіміраўна. — Цяпер робім акцэнт на пацыентах 61 плюс, бо яны ў першай групе рызыкі. Ковід вядзе да абвастрэння хранічных захворванняў, і гэта часта прыводзіць да сумных наступстваў. Людзі не робяць прышчэпку, таму што баяцца абвастрэння хранічных захворванняў. Але гэта няправільная пазіцыя. Трэба як мага хутчэй прышчапіцца. Яны калі і захварэюць, то ў лёгкай форме. Часам даходзіць да смешнага. Адзін пенсіянер неяк сказаў, што добра падрыхтаваўся да ковіду і... паказаў пульсаксіметр. Чалавек не разумее, што наяўнасць гэтага прыбора можа нават нашкодзіць. Калі чалавек часта мерае сатурацыю і нервуецца, яна можа падаць. Пачуццё недахопу паветра можа ўзнікнуць і ад панікі.

Спецыяльна ехаць у бальніцу дзеля прышчэпкі не спатрэбіцца, супакойвае суразмоўца. Вырашана адкрыць пяць прышчэпачных пунктаў у горадзе, каб кожнаму было зручна дабрацца. Расклад іх работы будзе такі, каб усім было зручна.

Жыхароў раёна абслугоўвае перасовачны пункт. На перыферыі працуе пяць амбулаторый урача агульнай практыкі і пяць ФАПаў. Яны фарміруюць спісы, колькі ахотных і калі ім зручна прышчапіцца, а кіраўніцтва райбальніцы, зыходзячы з гэтага, складае план на тыдзень.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.
г. Круглае.

Объявление о реализации недвижимого имущества ООО «Карпович» на четвертых повторных торгах

Организатор торгов	**ЧУП по оказанию услуг «ОтельИнвест» Адрес: 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 141/10, комн. 4, e-mail: Hotel_inv@mail.ru**
Продавец	**ООО «Карпович» г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 1, комн. 105 УНП 100146753, e-mail: dkarpovich@mail.ru**
Форма время дата и место проведения торгов	Четвертые повторные торги в форме открытого аукциона состоятся **30 декабря 2021 года в 10.30 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 1, пом. 540**
Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ними	**Изолированное помещение с инв. № 500/D-671227** (Наименование – помещение общественного питания; Назначение – помещение общественного питания) площадью 826,3 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Мележа, 5/1-105. Начальная цена – 1 432 200,00 белорусских рублей. Помещение обременено ипотекой ОАО «Сбер Банк» Ознакомиться с предметами лота можно с 11–16 в рабочее время, предварительно позвонив по тел.: +375291035050, +375293335803
Порядок проведения торгов	Сумма шага: 5 %. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов
Размер задатка для участия	Задаток – 9 % от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с BY34BPSB30121045401693300000 в ОАО «Сбер Банк», BIC BPSBBY2X, УНП 100146753. Получатель – ООО «Карпович»
Сроки и место приема заявок на участие в торгах	Прием заявлений на участие в торгах осуществляется с момента опубликования настоящего объявления **и до 27 декабря 2021 года**, в рабочие дни, с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 5 корп. 1, пом. 540. E-mail: Hotel_inv@mail.ru
Порядок заключения договора	Все расходы по переоформлению имущества возлагаются на покупателя. Победитель торгов оплачивает расходы по организации торгов. Заключение договора купли-продажи осуществляется по согласованию с регистратором РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в дер. Домашаны, ул. Цветочная, участок 2 (объект 14/2020), дер. Прилепская Усяжка (объект 169/2017), дер. Лужки, ул. Подгорная (объект 6/2019) Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

Организатор аукциона: Озерицко-Слободской сельский исполнительный комитет, 222215, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, д. 27, Смолевичский район, Минская область

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь (га)	Целевое назначение	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)
1	дер. Домашаны, ул. Цветочная, участок 2	624883003601000342	0,1370	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	20 000
2	дер. Прилепская Усяжка	624883008201000127	0,0814	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	12 000
3	дер. Лужки, ул. Подгорная	624883005601000186	0,1153	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	20 000

Аукцион состоится **19 января 2022 г. в 15.00** в Озерицко-Слободском сельском исполнительном комитете по адресу: аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Смолевичский район, Минская область, зал заседаний (тел.: 801776, 68030).

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by.

О созыве собрания акционеров ОАО «Слуцк-Модуль». Собрание состоится 14 **января** 2022 **года в** 10.00 по адресу: 223610, **Минская обл., г. Слуцк, ул.** 14 **Партизан, д.** 101. Телефон для справок А1 (8-044) 72 35 122.
УНП 600074992

О созыве собрания акционеров ОАО «Гуртпромстрой». Собрание состоится 17 **января** 2022 **года в** 12.00 по адресу: 223610, **Минская обл., г. Слуцк, ул. М. Богдановича, д.** 230**А**. Телефон для справок А1 (8-044) 72 35 122.
УНП 600154463

Вы прасілі расказаць

ТЫПОВЫЯ ПЫТАННІ ПРА ПЕНСІІ

«Якая ў мяне будзе пенсія?» — гэтае пытанне пачынае востра турбаваць людзей бліжэй да 50 гадоў. Многія фактары ўплываюць на памер пенсіі — па вялікім рахунку, у кожнага чалавека складваецца свая ўласная сітуацыя. Сёння ўся інфармацыя аб пенсійным забеспячэнні ёсць у адкрытым доступе, але людзям не заўсёды зразумелыя складаныя фармулёўкі афіцыйных дакументаў. Вольга ВАСІЛЕЎСКАЯ, намеснік старшыні Мінгарвыканкама па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, адказала на самыя папулярныя пытанні нашых чытачоў.

СТАЖ АДРОЗНІВАЕЦЦА

— У чым розніца паміж працоўным і страхавым стажам, як яны ўплываюць на памер пенсіі?

— Як правіла, стаж працы ўмоўна падзелены на агульны і страхавы. Агульны стаж уплывае на памер пенсіі, сюды ўваходзяць не толькі перыяды з выплатай страхавых узносаў, але і дзейнасць, калі грамадзянін не падпадае пад абавязковае сацыяльнае страхаванне. Напрыклад, перыяды навучання на дзённай форме, водпуск па доглядзе за дзіцем да дасягнення ім трох гадоў, догляд за непрацаздольнымі, служба ў войску.

Страхавы стаж вызначае права на пенсію і фарміруецца з перыядаў дзейнасці, на працягу якіх былі выплачаны абавязковыя страхавыя.

— Ці мае сёння значэнне бесперапыннасць стажу працы?

— Не, не мае.

— Праўда, што калі чалавек працаваў няпоўны каляндарны год, то гэта не ўлічваецца ў стаж?

— Не зусім так. Усе перыяды працы (іншыя віды дзейнасці) залічваюцца ў стаж, пацверджаны ў адпаведным парадку. У той жа час разлік сумы пенсіі робіцца на аснове поўных гадоў стажу. Напрыклад, пацверджаны стаж працы — 36 гадоў 5 месяцаў і 2 дні. Для вызначэння памеру пенсіі будуць улічвацца толькі поўныя 36 гадоў.

— Выходжу на пенсію ў 2022 годзе. Ці будзе «савецкі» стаж работы прыняты пад увагу, акрамя таго, што ў той час меўся добры заробак?

— Так, перыяд работы ў савецкія часы таксама ўключаны ў адпаведны стаж пры прызначэнні пенсіі.

Аднак, улічваючы, што ў 2022 годзе заробак для вылічэння пенсіі будзе брацца за апошнія 28 гадоў работы, магчымы перыяд пачынаецца з 1994 года. У выпадку, калі ў гэты час паміж месцамі работы былі перапынкі, перыяд для разліку пенсіі ссунуты, гэта значыць, можа быць улічаны заробак і да 1994 года.

ПАГЛЯДЗІЦЕ СПІС ДАЎЖНІКОЎ ФСАН

— З 1992 да 1996 года чалавек працаваў у прыватнай арганізацыі. Запіс у працоўнай кніжцы ёсць. Заробак атрымліваў па ведамасці. Як даведацца, ці плацілі за той час узносы ў Пенсійны фонд?

— Выплата страхавых узносаў з'яўляецца неабходнай пенсійнай умовай для стажу работы, які праходзіў пасля 1 ліпеня 1998 года. Да гэтай даты перыяды работы залічваюцца ў працоўны стаж незалежна ад факту выплаты і памеру страхавых узносаў.

— Прыватная фірма была ліквідавана ў той час, калі без пасведчання аб адсутнасці доўгу ў Пенсійны фонд было немагчыма яе закрыць. Гэта значыць, я разумею, што ўзносы былі аплачаныя. Людзі тады не думалі аб тым, каб браць нейкія даведкі пра заробак. Як пацвердзіць, што ўзносы за нас заплацілі, калі няма кантактаў з былымі калегамі?

— Інфармацыю аб выплаце абавязковых страхавых узносаў вы можаце атрымаць у органах Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на месцы рэгістрацыі кампаніі, пры сабе неабходна мець пашпарт і картку страхавання. Звесткі аб заработнай плаце ў выпадку немагчымасці атрымання даведкі аб заробку могуць быць установлены ў судовым парадку.

— Як даведацца, ці плаціць работадавец узносы ў ФСАН? Што рабіць у сітуацыі, калі работадавец не плаціць, а людзям прыспеў час выходзіць на пенсію?

— На сайце Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, www.ssf.gov.by ў раздзеле «Збор і выплаты страхавых узносаў» існуе (і штоквартальна абнаўляецца) падраздзел «Даўжнікі». Кожны чалавек можа паглядзець, ці ёсць у гэтым спісе арганізацыя, у якой ён працуе. Калі ўзносы не выплачваюцца, я рэкамендую звярнуцца ў органы сацыяльнай абароны насельніцтва на месцы рэгістрацыі кампаніі і атрымаць афіцыйнае пацвярджэнне гэтага факта.

Важна разумець, што ў выпадку нявыплаты страхавых узносаў перыяд работы і, адпаведна, заробак не будуць прынятыя пад увагу пры разліку пенсіі. Таму, атрымаўшы дакумент па запазычанасці па ўзносах, вы можаце пайсці ў суд, напісаць скаргу ў інспекцыю па працы.

— У некаторых краінах ёсць магчымасць «купіць» страхавы стаж, калі яго не хапае. Чалавеку ж шкада страціць пыстойную пенсію, калі не хапае, напрыклад, шасці месяцаў або года такога стажу. Ці разглядаецца падобная магчымасць ў нашай краіне?

— У цяперашні час «купля» страхавога стажу заканадаўствам нашай краіны не прадугледжана.

— Страхавы стаж зрабіў рэзкі скачок. Яшчэ ў 2013 годзе ён быў 10 гадоў, а да таго ўвогуле ўсяго пяць. Якая перспектыва пенсіённага забеспячэння ў тых людзей, якія не паспеюць зарабіць неабходны стаж да моманту дасягнення пенсійнага ўзросту?

— Ім будуць налічваць сацыяльную пенсію, пры гэтым жанчыны яе змогуць атрымліваць у 60 гадоў, мужчыны ў 65, гэта значыць на два гады пазней, чым тыя пенсіянеры, у якіх дастаткова страхавога стажу. У такім жа ўзросце налічваецца працоўная пенсія пры няпоўным страхавым стажы, якога павінна быць не менш за 10 гадоў.

АД ЧАГО ЗАЛЕЖЫЦЬ ПАМЕР ПЕНСІІ?

— Ці можа чалавек выбраць гады, паводле якіх памер заработнай платы прымаецца пад увагу пры налічэнні пенсіі?

— Не, пенсійнае права ўстанаўлівае пэўны перыяд для вызначэння заробку. У гэтым годзе ім з'яўляюцца апошнія 27 гадоў стажу, у 2022 годзе — 28 гадоў і гэтак далей, перыяд штогод павялічваецца на 1 год — да 30 гадоў.

Год	Страхавы стаж	Апошнія гады работы для разліку пенсій
2021	18 гадоў	27 гадоў
2022	18 гадоў 6 месяцаў	28 гадоў
2023	19 гадоў	29 гадоў
2024	19 гадоў 6 месяцаў	30 гадоў
2025	20 гадоў	30 гадоў
2026	і найбліжэйшыя 20 гадоў	30 гадоў

— Па працоўнай кніжцы працавала з 1982 года да 2005-га, затым — па дагаворах падраду, з 2012 да 2014-га была ІП з выплатай мінімальнага ўзносу ў Пенсіённы фонд, цяпер працягваю працаваць па дагаворах падраду. Наколькі я ведаю, для ўстанаўлення памеру пенсіі ў маім выпадку будуць разглядацца гады з 1994 да 2023-га. Такі вось казус: стаж ёсць, а як ўлічыць заробак па дагаворах падраду?

— У заробак для вылічэння пенсіі ўключаюцца выплаты ўсіх відаў у грашовым і (або) натуральным выражэнні, налічаныя на карысць грамадзяніна, які працуе па ўсіх падставах незалежна ад крыніц фінансавання, уключаючы ўзнагароджанні па грамадзянска-прававых дагаворах. Таксама ўключаюцца выплаты застрахаванай асобе, якая падлягае абавязковаму страхаванню ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, даходы фізічнай асобы, якая самастойна выплачвае абавязковыя страхавыя ўзносы ў бюджэт фонду, на якія згодна з заканадаўствам аб дзяржаўным сацыяльным страхаванні налічваліся і з якіх выплачваліся абавязковыя страхавыя ўзносы ў названы бюджэт.

— Па маіх падліках, мая пенсія будзе каля 480 рублёў. Калі я не буду афармляць яе два гады, на колькі яна павялічыцца? А калі на працягу года зменяцца абставіны і я не змагу працаваць, ці можна адкласці заяву аб працягу работы?

— У першы год за кожныя два месяцы пенсія павялічваецца на 1 %, на другі поўны год — на 8 %, затым яшчэ больш. Заяву аб працягу работы можна адкласці. Калі чалавек працаваў, напрыклад, паўгода, то пенсія павялічыцца прапарцыянальна адпрацаванаму часу, гэта значыць на 3 %.

А РАНЕЙ МОЖНА?

— Да выхаду на пенсію — два гады. Працоўны стаж 30 гадоў, страхавы — 25. Цяпер бацька афармляе дакументы па інваліднасці і будзе мець патрэбу ў пастаянным доглядзе. Ці магу я пры такіх абставінах датэрмінова выйсці на пенсію. Што для гэтага патрабуецца?

— Датэрміновы выхад на пенсію ў дадзеным выпадку заканадаўствам не прадугледжаны. Аднак у выпадку ўстанаўлення бацьку інваліднасці I групы і ажыццяўлення пастаяннага догляду за ім можна аформіць дапамогу па доглядзе інваліда I групы пры ўмове незанятасці, то-бок давядзецца звольніцца з работы. Гэты перыяд будзе ўключацца ў агульны стаж і ўлічвацца пры вызначэнні памеру пенсіі. У страхавы стаж для вызначэння права на пенсію такі перыяд не ўключаецца.

— За колькі часу да наступлення пенсіённага ўзросту трэба пачынаць збіраць і афармляць дакументы? Ці вызначана законам, хто гэта павінен рабіць? На прыкладзе сваякоў бачу, што ў аднаго гэтым займаецца аддзел кадраў, другі — сам збірае дакументы...

— Грамадзяне, якія працуюць, звяртаюцца па прызначэнне пенсіі праз свайго работадаўца, які, у сваю чаргу, займаецца афармленнем усіх неабходных дакументаў. Непрацуючыя грамадзяне робяць гэта самастойна, звярнуўшыся ва ўпраўленне сацыяльнай абароны па месцы пастаяннай рэгістрацыі: пры сабе неабходна мець працоўную кніжку, пашпарт і картку сацстраху. Тут жа можна атрымаць неабходную кансультацыю.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.

Карысныя спасылкі

komtrud.minsk.gov.by — Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама;

SSF.GOV.BY — Фонд сацыяльнай абароны;

+375 17 352 05 01 — шматканальны тэлефон кансультацыйна-аналітычнага аддзела пры Мінскім гарадскім упраўленні ФСАН.

Яўгена ПЯСЕЦКАГА

фота слова

Я збіраў рыфмы новыя
Ў навагоднія вершы —
Пра малюнкі зімовыя,
Пра надвор'е ў снежні.

Толькі зноў дождж з ранку
Ды іміжа зноў пад вечар...
Усе канькі, лыжы, санкі —
Непатрэбныя рэчы.

Футры ў шафе зімуюць,
Як з мінулага госці,
І пра нешта сумуюць,
І чакаюць кагосьці.

Я ўначы прачынаюся —
Ад надвор'я залежу —
І ў думках пытаюся:
— Дзе твой снег, браце-снежань?

Падзея

На радасць блізкім і не толькі

З 22 снежня да 6 студзеня пры падтрымцы Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ў Мінску пройдзе міжнародны праваслаўны фестываль «Радасць». Яго па бласлаўленні мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха усяе Беларусі рыхтуе Свята-Елісавецінскі манастыр.

Гэта выдатная магчымасць даведацца больш пра традыцыі святкавання Каляд. Святочную атмасферу будуць задаваць музыкі і творцы. Запланаваны канцэрты духоўных песнапенняў, выстаўкі калядных батлеек, батлеечныя спектаклі.

Фестываль ладзіцца з мэтамі захавання і развіцця духоўнай культуры, асветы і выхавання патрыятызму. Да яго далучаюцца не толькі свяшчэннікі і манахіні, сваімі ведамі і парадамі будуць дзяліцца ўрачы, псіхолагі, пісьменнікі, прадстаўнікі творчых прафесій.

Сёлета праграма распрацоўвалася адметна, каб прывабіць сем'і, і тут будуць свае актыўнасці для прадстаўнікоў розных узростаў. Так, малых чакаюць на ранішніках з Дзедам Марозам і ў гульнявой дзіцячай зоне. Тут пройдзе шэраг майстар-класаў, падчас якіх можна зрабіць уласнымі рукамі падарункі блізкім ці цацкі на ёлку, памаляваць. Будуць працаваць мастацкая выстаўка, кіназона і «кабінет здароўя».

На інтэрактыўнай пляцоўцы можна азнаёміцца з тым, як сустракаюць навагоднія святы ў розных краінах свету.

І, вядома, запрацуе вялікі калядны кірмаш з вырабамі манастыроў і рамеснікаў, сярод якіх абразы, святочныя сувеніры, размаляваная кераміка, кнігі, тэкстыль, швейныя вырабы, прадукцыя для прыгажосці і здароўя. А таксама гасцей фестывалю чакаюць салодкія пачастункі, хатняя выпечка і стравы з манастырскай трапезнай.

Традыцыйна ў межах фестывалю ладзіцца і дабрачынная акцыя.

Фестываль пройдзе ў Палацы мастацтваў, з яго праграмай можна будзе азнаёміцца на сайце festradost.by.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Жыццялюбы

72 АДЦЕННІ БЕЛАГА

Настаўніца з Бігосава піша карціны... бярозавай карой

Галіна ТУШКІНА жыве ў аграгарадку Бігосава, што на Верхнядзвіншчыне. Днём яна працуе настаўніцай абслуговай працы ў мясцовай школе. А па вечарах піша незвычайныя карціны. Не пэндзлямі ды фарбамі, а лідскім клеем ды бярозавай карой.

Пра любоў з першага дотыку, валежнік і карэльскую бярозку

Раман з бяростай у Галіны Віктараўны закруціўся гадоў сем таму. Спантанна, можна сказаць, з першага дотыку. Настаўніца вельмі любіць гуляць па лесе. Неяк раз спынілася каля бярозкі. Глядзіць, кавалачак кары адслаіўся.

— Пакруціла я тую кару ў руках, стала на стужачкі дзяліць. І так яна лёгка дзеліцца, — згадвае Галіна Тушкіна. — А на дотык бяроста якая прыемная! «Ой, Пеця (звяртаюся да мужа), паглядзі, які цуд! Дык гэта ж выдатны матэрыял для творчасці! Нездарма ж нашы дзяды і прадзеды цанілі бярост: рабілі з яе лапці, кораб для ягад, посуд...» Муж у той момант не далучыўся да майго захаплення... Цяпер жа дапамагае нарыхтоўваць бяросту. Ужо ведае, якая мне больш падыдзе. У лесе пастаянна чую ад яго: «Ой, Галя, толькі глянь, якую я табе бярозку знайшоў! Падзівіся, якое цікавае адценне».

Гэта толькі на першы погляд здаецца, што ўсе бярозкі белыя. Насамрэч колер бярозы залежыць ад таго, дзе расце дрэва: у лесе або на балоце, на сонцы або ў цені.

— Я неяк вырашыла падлічыць адценні бярозы, — кажа мая суразмоўніца. — Дык налічыла ажно 72! І гэта, перакананна, яшчэ не мяжа. Неяк у Глыбокім у дэндрапарку пабачыла карэльскую бярозу. Гляджу, на ёй кавалачак кары адлупіўся. Мне дазволілі яго зняць і забраць сабе. Дык вось, толькі на тым невялікім лапіку я налічыла ажно восем адценняў колеру: ад цёмна-карычневага да светла-карычневага. Я заўсёды паўтараю: бяроста — наш унікальны прыродны матэрыял. Як яе не любіць, не ведаю.

Людзі, якія ўпершыню бачаць карціны Галіны Віктараўны, не разумеюць, з чаго яны зроблены.

Кару сямейная пара пачынае зразаць толькі пасля таго, як бярозы адплакалі. Падчас сокавыдзялення гэта рабіць ні ў якім разе нельга, падкрэслівае мая гераіня, бо можна нашкодзіць дрэву, і яно захварэе. Шмат бярозы для сваіх карцін Галіна Віктараўна наогул знаходзіць літаральна пад нагамі. Гуляючы па лесе, не праходзіць міма валежніку. Ужо дома прынесеную кару сартуе па колерах. Захоўвае ў хлеўчуку ў кардонных скрынках. Кажа, што гэта вельмі зручна.

— Задумала я, напрыклад, зрабіць зімовы пейзаж, нясу дадому скрынкі з карой белых і ружаватых адценняў, — тлумачыць Галіна Віктараўна. — Для восеньскага ж краявіду падыдзе жаўтаватая і карычневатая бяроста.

Пра дзёгцевае мыла, бурштын ад сына і лідскі клей

Свае карціны мастачка піша дома ў цішыні, як правіла, па вечарах.

— Муж вельмі здзіўляецца, калі раптам пасля работы я вырашаю заняцца чымсьці іншым (*смяецца*). Калі кантактую з бяростай, стому як рукой здымае. Яна дае мне столькі жыццёвай энергіі, што магу гадзін да трох ночы рабіць пано. Заўважыла, калі працую з карой, рукі сябе вельмі добра адчуваюць. Не сакрэт, што бяроста валодае лекавымі ўласцівасцямі, нармалізуе ціск. Нават абдымеш бярозку, пастаіш побач з ёй — ужо лягчэй на душы робіцца. Я, дарэчы, даўно не мыюся шампунямі — толькі мылам, у якім ёсць бярозавы дзёгаць (ён атрымліваецца з бяросты пасля яе тамлення ў цяпле ў герметычнай ёмістасці). Гэта выдатны прыродны антысептык. Бяру дзёгцевае мыла з сабой і ў басейн. І мая скура адчувае сябе цудоўна нават пасля плавання ў хлараванай вадзе.

Для сваіх карцін Галіна Тушкіна выкарыстоўвае выключна бярозавую кару.

— Некаторыя, ведаю, дадаюць на свае пано з кары сушаныя лісцікі, кветачкі. Але ўсё гэта з часам выцвітае. А бяроста (як і саломка, што гадамі выстаўляецца ў музеях і не губляе свайго золата) даўгавечная. Таму не хачу ні з чым яе змешваць. Мой сярэдні сын жыве ў Калінінградзе. Калі прыязджае ў госці, заўсёды прывозіць бурштын, што збірае на моры. Часам магу прыклеіць да сваёй карціны некалькі дробных каменьчыкаў, якія нагадваюць лісточкі на бярозцы. Ці «кінуць» сонечны бурштынчык у ваду. Але гэта вельмі рэдка. Лічу, што бяроста самадастатковая.

Кару Галіна Віктараўна адмыслова не падфарбоўвае, лакам не пакрывае. Пакідае, як ёсць, натуральнай, прыроднай. Дарэчы, менавіта прырода — галоўная крыніца натхнення для мастачкі. Таму нядзіўна, што на большасці яе карцін — лес, рэчка, луг, жывёлы і птушкі...

— Неяк пабачыла, як ласі перабягалі дарогу, — захацелася адлюстраваць гэта на карціне, — кажа настаўніца. — Заўважыла, як лебедзі ўзняліся над вадой перад адлётам у вырай — таксама накідала эскіз.

Яшчэ адно з захапленняў настаўніцы — брошкі з маланак ад куртак.

Галіна Віктараўна заўсёды пачынае з таго, што малюе эскіз. А толькі пасля аздабляе яго тонкімі шматочкамі бяросты. Толькі прыгледзьцеся, колькі там маленькіх кавалачкаў наклеена! Клеі, дарэчы, жанчына спрабавала розныя. У выніку спынілася на нашым, лідскім ПВА, бо ён не псуе бяросту — не пакідае ніякіх плям, не жаўцее.

Пра тэлефон-аўтамат, Росіцкі касцёл і маланкі ад куртак

— Самае складанае і адначасова цікавае — гэта падабраць кару па колеры, спалучыць розныя яе адценні, — дзеліцца Галіна Тушкіна. — У гэтым мне вельмі дапамагаюць веды, атрыманыя на мастацка-графічным факультэце.

Галіна Віктараўна ў свой час скончыла Віцебскі ўніверсітэт імя П. М. Машэрава. Хоць усё магло скласціся зусім інакш.

— Мая мама, настаўніца, пастаянна паўтарала: толькі не ідзі ў педагогіку. Яна марыла, каб дачка стала ўрачом. І вось я паехала падаваць дакументы ў медінстытут. У цягніку пазнаёмілася з дзяўчынай, яна з Латвіі ехала ў Віцебск паступаць на мастацка-графічны факультэт. Пытаецца ў мяне: «А ты малюеш?» Я дастала нататнік і паказала ёй свае малюнкі. У выніку мы разам падалі дакументы на мастацка-графічны факультэт. Маме я ні слова пра гэта не сказала. Першым экзаменам было чарчэнне. Званю з тэлефона-аўтамата і кажу: «Мама, я трымала пяцёрку». — «Малайчынка, — чую радасны голас. — А па якім прадмеце?» — «Мама, ты лепш прысядзь. Па чарчэнні!» Так я прызналася, што не падавала дакументы ў медінстытут. І ні разу не пашкадавала аб гэтым, бо па жыцці трэба займацца тым, да чаго горнецца душа.

Свае бяроставыя карціны Галіна Віктараўна не толькі выкарыстоўвае для ўпрыгожвання ўласнага дома, але і прадае. Некалькі работ настаўніцы дэлегацыя з райвыканкама вазіла ў якасці падарунка, у тым ліку і ў Расію. Сярод іх і выявы знакамітых храмаў Верхнядзвіншчыны — Сар'янскай царквы і Росіцкага касцёла.

— Каб зрабіць пейзаж, кару я звычайна проста рву — у выніку атрымліваюцца натуральныя, прыродныя лініі. Каб жа «пабудаваць» храм, патрэбна дакладнасць. Таму, каб выразаць роўныя дэталі, карыстаюся нажніцамі.

Падчас нашай размовы ў кабінет Галіны Віктараўны зайшла настаўніца, з якой яны сябруюць.

— Вось сяброўка падказвае, што я яшчэ брошкі арыгінальныя раблю. З маланак ад адзення. Нават не купляю іх, дару другое жыццё тым, што былі ў карыстанні. Знаёмая працуе швачкай, дык ёй людзі прыносяць курткі, каб памяняць старыя маланкі на новыя. Яна іх не выкідае, мне адкладае. Памыю іх і ператвараю ў брошкі. Ужо штук сто, напэўна, зрабіла.

Пачалося ж усё таксама спантанна. Неяк на выставу трэба было зрабіць калядны вянок. А чым яго ўпрыгожыць? Вось Галіна Віктараўна і згадала, што ў яе дома ляжыць цэлая скрынка маланак ад куртак. Збірала проста так — а раптам спатрэбяцца? Вось і спатрэбіліся. Нарабіла тады з іх цацак ды аздобіла калядны вянок.

А яшчэ Галіна Тушкіна збірае званочкі з розных куточкаў свету. У яе калекцыі іх ужо больш за 1000. Пачалося ўсё са званочка, які сяброўка прывезла ў падарунак з Вялікіх Лукаў. Галіну Віктараўну зачараваў яго звон. З таго часу адусюль, дзе толькі не бывае, прывозіць званочкі. Большую ж палову калекцыі, кажа, падарыў муж Пётр. Менавіта ён і прыдумаў арыгінальны спосаб яе захоўвання: падвесіў пад стол на драўляныя колы ад цяляг і. Дарэчы, у калекцыі Галіны Віктараўны багата бразготак ды званочкаў, якія даўней вешалі на шыю коням падчас вясельляў ды іншых свят.

З таго часу і робіць брошкі. Падбірае да кожнай сукенкі — сваю, непаўторную. Аздабляе іх цікавымі бусінамі ды гузікамі.

— Я і дзяцей у школе навучыла такія брошкі рабіць. Ім гэта даспадобы. А вось з бяростай вазіцца не вельмі падабаецца. Калі бачаць мае карціны, захапляюцца: «Ой, Галіна Віктараўна, як прыгожа!» Ну дык, кажу, давайце я вас навучу. Але іх надоўга не хапае. Сучасным дзецям трэба хутчэй канчатковы вынік. А пано з кары — карпатлівая праца.

На развітанне Галіна Віктараўна паказвае мне свой роспіс па тканіне з выявай Спаса-Ефрасіннеўскай царквы, брошкі, зробленыя са стужак... І дадае: «Чым толькі не займалася я ў сваім жыцці. І макрамэ, і ганчарствам, і аплікацыямі з саломкі... Мне ўсё гэта падабаецца. З задавальненнем асвойваю штосьці новае, эксперыментую. Але бяроста па-за канкурэнцыяй. Я ёй ніколі не здраджу. Гэта ўжо любоў на ўсё жыццё».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК,
Верхнядзвінскі раён.

Лепш папярэдзіць

АСЦЯРОЖНА, СЛІЗКА!

Як пазбегнуць зімовых траўмаў пешаходам і не стаць ахвярамі аўтамабілістам

Зіма — час павышанага траўматызму. Сярод прычын — галалёд, ранняе наступленне цемры і наш абутак, які часцей за ўсё бывае слізкім. Згодна са статыстыкай, на зімовы траўматызм прыпадае да 15 % захворванняў з часовай стратай працаздольнасці. А ў некаторыя зімовыя дні колькасць траўмаў увогуле павялічваецца ў 2-3 разы. Уплывае галалёдзіца і на аварыйнасць на дарозе. У такія дні пабітых машын становіцца значна больш. Як паводзіць сябе пешаходам, каб засцерагчыся ад падзення, які абутак выбіраць зімой і як правільна ўпасці, а таксама што павінны рабіць кіроўцы, каб пазбегнуць непрыемнасцяў у той час, калі зімовае надвор'е становіцца выпрабаваннем, расказалі медыкі і прадстаўнікі ДАІ.

Не трэба спяшацца

Як сведчыць статыстыка, зімой у структуры траўмаў пераломы касцей займаюць да 15 %, вывіхі — да 10. Каля 80 % пацярпелых — асобы працаздольнага ўзросту. Пажылыя людзі, старэйшыя за 60 гадоў, траўміруюцца радзей, яны складаюць каля 8 %.

— Асноўнай прычынай траўматызму зімой з'яўляецца банальная спешка. Многія не заўважаюць лёд, прыцярушаны снегам, падаюць і атрымліваюць розныя траўмы, — нагадвае **намеснік галоўнага ўрача па траўматолага-артапедычнай дапамозе 6-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска, галоўны пазаштатны дзіцячы траўматолаг-артапед камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, дацэнт, кандыдат медыцынскіх навук Станіслаў ТРАЦЦЯК.**

Найбольш частыя пераломы прамянёвай косці, шчыкалатак, касцей галёнкі, удары пляча, пашкоджанні звязкавага апарату. І тлумачацца гэтыя траўмы проста. Пры падзенні інстынктыўна мы выстаўляем уперад рукі, у выніку чаго атрымліваем пералом прамянёвай косці ў тыповым месцы. Што датычыцца пераломаў шчыкалатак, то ў асноўным яны звязаныя з абуткам, прычым пераважна на высокім абцасе. Адбываецца падварочванне ў галёнкаступнёвым суставе, з-за чаго жанчына атрымлівае падобную траўму.

Пажылыя людзі павінны памятаць, што ў іх узросце ломкасць касцей павялічваецца, а эластычнасць звязкавага апарату зніжаецца. Пры падзенні адбываюцца дастаткова сур'ёзныя пашкоджанні, часцей за ўсё гэта пераломы шыйкі сцегнавой косці, і такія траўмы ў асноўным патрабуюць хірургічнай аперацыі.

Амаль у 30 % выпадкаў траўмы суправаджае алкагольнае ап'яненне. У зімовы перыяд яно можа стаць прычынай не толькі перахаладжэння, абмарожання кісцяў і ступняў, але і замярзання нават пры невялікіх маразах.

Як не ўпасці падчас галалёду?

Рызыку падзення можна зменшыць, калі прытрымлівацца некалькіх простых правілаў. Абутак павінен быць на плоскай падэшве з нізкім квадратным абцасам. Можна прымацаваць на падэшву звычайны лейкапластыр ці нават палоску наждачнай паперы. Але лепш, калі гэты абутак з рыфлёнай падэшвай.

Хадзіць у галалёд таксама варта па-асабліваму: быццам бы слізгаючы на маленькіх лыжах, ступаючы пры гэтым на ўсю падэшву. Уважліва глядзець пад ногі, ісці не спяшаючыся, бо чым хутчэй мы ідзём, тым большая рызыка ўпасці. Жанчынам падчас галалёду варта выбіраць абутак на невысокім тоўстым абцасе. Калі носіце доўгае паліто ці футра, трэба абавязкова падняць падол адзення, калі выходзіце з транспарту ці спускаецеся па лесвіцы. Не хадзіце ўздоўж сцен будынкаў, памятаючы, што з даху можа ўпасці лядзяш ці камяк снегу.

Як правільна падаць?

Калі адчуваеце, што страчваеце раўнавагу, трэба пастарацца згрупавацца, каб змякчыць сілу ўдару. Па магчымасці прысесці, каб зменшыць вышыню падзення. Пры падзенні напружыць мышцы, што дазволіць абысціся сінякамі. Больш бяспечна падаць на бок — так можна захаваць цэлымі косці таза, пазваночнік і канечнасці. Галаву лепш уцягнуць у плечы, рукі прыціснуць да бакоў, спіну выпрастаць, ногі злёгку сагнуць. Здаецца, што параду лёгка выканаць, але падзенне звычайна адбываецца нечакана, таму лепш патрэніравацца, як дзейнічаць у такой сітуацыі.

І яшчэ некалькі парад. Пры падзенні на спіну абавязкова прыціснуць падбародак да грудзей, рукі раскінуць шырэй. Калі падаеце на слізкай лесвіцы, пастарайцеся прыкрыць твар і галаву рукамі. Не імкніцеся затармазіць падзенне нагамі — часта гэта канчаецца яшчэ большымі пашкоджаннямі.

Калі адбылося падзенне, па магчымасці трэба пазбегнуць руху пацярпелай канечнасці, можна з дапамогай падручных сродкаў. Што датычыцца медыцынскіх установ, куды трэба звяртацца пацыентам з траўмамі, у Мінску сярод стацыянараў гэта прыёмнае аддзяленне 6-й гарадской клінічнай бальніцы, бальніца хуткай медыцынскай дапамогі і прыёмнае аддзяленне РНПЦ траўматалогіі і артапедыі. Што датычыцца амбулаторных устаноў, тут маюцца траўмпункты, якія ажыццяўляюць дапамогу кругласутачна. Яны працуюць на базе сталічных 2-й, 19-й і 40-й паліклінік.

— Асноўным спосабам прафілактыкі траўмаў зімой з'яўляецца абачлівасць і асцярожнасць пры перамяшчэнні, — кажа Станіслаў Трацціяк.

Не пацярпець ад піратэхнікі

Пакуль у дзіцячым траўматолага-артапедычным аддзяленні 6-й гарадской бальніцы, паводле інфармацыі Станіслава Трацціяка, няма ніводнага дзіцяці з траўмамі ад катання на цюбінгах. У апошнія гады гэта праблема стаяла дастаткова востра, цяпер жа катанне адбываецца ва ўстаноўленых месцах, а колькасць сур'ёзных траўмаў істотна знізілася.

Колькасць траўмаў у выніку выкарыстання піратэхнікі апошнім часам таксама зменшылася. Яны, як правіла, дастаткова сур'ёзныя, звязаныя з пашкоджаннем пальцаў рук і кісці. Тут вельмі важна чытаць інструкцыю, каб загадзя азнаёміцца, як правільна выкарыстоўваць тую ці іншую піратэхніку. Галоўнае, максімальна далёка адысці ад месца запуску. Траўмы адбываюцца, калі піратэхніка трапляе ў рукі дзяцей, якім цікава, як яна ўзрываецца, вельмі часта яны нават імкнуцца трымаць яе ў руках. Такія траўмы, як правіла, заканчваюцца сур'ёзнымі наступствамі.

Куды паведаміць пра нячышчаныя дарогі?

Для зніжэння аварыйнасці і траўматызму штогод у кастрычніку-лістападзе ДАІ праводзіць абследаванне вуліц і дарог, правярае спраўнасць дарожнага асвятлення і тэхнічных сродкаў арганізацыі дарожнага руху. Асаблівая ўвага аддаецца падрыхтоўцы дарожнай сеткі да эксплуатацыі ў зімовых умовах, забеспячэнню дарожных службаў антыгалалёднымі матэрыяламі, палівам, тэхнікай і абсталяваннем для работы ў зімовых умовах.

З надыходам халадоў у межах маніторынгу супрацоўнікі ДАІ вывучаюць такія пытанні, як своечасовая ачыстка праезнай часткі і тратуара ад наледзі і снегу, што зніжае імавернасць ДТЗ і траўміравання пешаходаў. У тым ліку ажыццяўляецца штодзённы кантроль за станам дарог і тым, як дарожныя службы выконваюць парадак іх утрымання. Тут таксама аддаецца ўвага своечасовай ачыстцы дарог і тратуараў.

Адзіны нумар 125, які належыць Міністэрству транспарту і камунікацый, прызначаны для інфармавання аб нерасчышчаных дарогах, абочынах, неспрыяльных дарожных умовах, пра гэта на лінію можа паведаміць кожны.

Цярпяць і аўтамабілі

У Беларусі за 10 месяцаў гэтага года зарэгістравана 2 973 ДТЗ, у якіх 469 чалавек загінулі, 3 184 атрымалі раненні.

— З прыходам першага снегу і галалёдзіцы павялічваецца колькасць аварый, але дробных, дзе пашкоджанні атрымліваюць толькі аўтамабілі. Рытм руху па загарадных і гарадскіх трасах змяншаецца, адпаведна, рызыкі больш цяжкіх ДТЗ мінімізуюцца, — тлумачыць **старшы інспектар па асобых даручэннях аддзялення арганізацыі міжведамаснага ўзаемадзеяння і прапаганды бяспекі дарожнага руху ўпраўлення дарожна-патрульнай службы і прафілактыкі галоўнага ўпраўлення ДАІ міліцыі грамадскай бяспекі МУС Аляксандр БРУЙ.**

Асноўныя прычыны дарожных здарэнняў, у якіх церпяць людзі, — парушэнне праезду пешаходных пераходаў, невыкананне чарговасці праезду скрыжаванняў, перавышэнне хуткасці і парушэнне правілаў манеўравання. Сярод відаў ДТЗ лідзіруюць сутыкненні транспартных сродкаў (1270), здарэнні з удзелам аўтамабіля і пешахода (943), ДТЗ з удзелам аднаго транспартнага сродку на скрыжаваннях, наезд на перашкоду, перакульванне.

За 10 месяцаў гэтага года (у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага) зменшылася колькасць здарэнняў з удзелам дзяцей. Сёлета ў ДТЗ загінула 17 непаўналетніх, яны былі пасажырамі транспартных сродкаў, пешаходамі, веласіпедыстамі. Больш за 75 % дзяцей пацярпела па віне кіроўцаў. Пацярпелых часта перавозілі без дзіцячых утрымліваючых прылад. Больш за 150 непаўналетніх атрымала траўмы як пешаходы, з іх 149 былі траўмаваны, 5 загінула. Сярод іх 51 % атрымаў траўмы на нерэгулюемым пешаходным пераходзе, 32 % — на рэгулюемым, 12 % ішлі на забаронены сігнал святлафора. 67 непаўналетніх атрымалі траўмы ў якасці веласіпедыстаў.

Зіма патрабуе невысокай хуткасці

— Перапады тэмпературы садзейнічаюць галалёдзіцы, і з году ў год гэта суправаджаецца павышанай аварыйнасцю, — адзначае Аляксандр Бруй. — Падчас галалёдзіцы счапленне аўтамабільных шын з дарожным пакрыццём значна змяншаецца, адпаведна, тармазны шлях павялічваецца ў разы. Небяспечна, калі колы падчас руху блакіруюцца і любое рэзкае змяненне хуткасці можа выклікаць занос. Пры такіх умовах для кіроўцы важныя абачлівасць, нізкая хуткасць і плаўнасць рухаў.

Тармажэнне мусіць быць абмежаваным і выконвацца на ўключанай перадачы. Напрамак руху варта мяняць вельмі асцярожна, каб пазбегнуць заносаў. З іх у галалёдзіцу складана выйсці нават тым, хто мае пэўны досвед. Неабходна плаўна прыбаўляць газ пры разгоне, асабліва гэта датычыцца заднепрывадных аўтамабіляў. Пры павароце трэба праязджаць на пастаяннай хуткасці, загадзя знізіўшы яе да мінімуму. І, зразумела, быць прышпіленымі рамянямі бяспекі — не толькі кіроўцам і пасажыру на пярэднім сядзенні, але і пасажырам на заднім сядзенні. Вельмі ўважлівымі варта быць пры праездзе пешаходных пераходаў.

Пешаходы таксама мусяць быць максімальна пільнымі пры перасячэнні праезнай часткі. Нават на рэгулюемым пешаходным пераходзе выхад на дарогу варта пачынаць, толькі ўпэўніўшыся, што ўсе аўтамабілі спыніліся і прапускаюць. Прыбліжацца да праезнай часткі трэба таксама вельмі акуратна, каб не паслізнуцца на дарозе. У цёмны час сутак варта абазначаць сябе святлоадбівальнымі элементамі.

З 1 снежня інспектары ДПС адсочваюць наяўнасць на аўтамабілях зімовых шын. Першае парушэнне можа пацягнуць штраф у адну базавую велічыню (29 рублёў), паўторнае — ад 2 да 5 базавых велічынь.

Перад паездкай зімой варта падрыхтавацца: праверыць усе вадкасці ў аўтамабілі, акумулятар, уладальнікам дызельных аўтамабіляў варта выкарыстоўваць спецыяльнае паліва, якое не будзе замярзаць пры нізкіх тэмпературах. Калі вы вымушаны спыніцца з-за няспраўнасці на дарозе, варта максімальна абазначыць месца спынення — выставіць знак аварыйнага спынення, уключыць аварыйную сігналізацыю. І як мага хутчэй прыняць усе меры для аператыўнага перамяшчэння аўтамабіля бліжэй да абочыны ці ў іншае бяспечнае месца.

Алена КРАВЕЦ.

ПАД УВАГАЙ — БЯСПЕКА

Міністры аховы здароўя Расіі і Беларусі абмеркавалі ўдасканаленне сістэмы кантролю якасці

Сумесная калегія Міністэрства аховы здароўя Расіі і Беларусі прайшла ў Маскве. Удзел у пасяджэнні ўзялі міністры аховы здароўя Міхаіл Мурашка і Дзмітрый Піневіч, Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Уладзімір Сямашка.

Асноўная тэма абмеркавання — удасканаленне сістэмы кантролю якасці медыцынскай дапамогі.

Аб рабоце сістэмы кантролю якасці меддапамогі ў Расіі расказаў Міхаіл Мурашка, а Дзмітрый Піневіч праінфармаваў аб фарміраванні сістэмы кіравання якасцю меддапамогі ў Беларусі. Таксама ўдзельнікі калегіі абмеркавалі пытанні падрыхтоўкі медыцынскіх спецыялістаў і іх допуск да прафесійнай дзейнасці. Гэтыя пытанні непасрэдна ўплываюць на якасць аказання меддапамогі, а значыць, вельмі важныя для кіраўнікоў сістэм аховы здароўя. Асноўнымі дакладчыкамі па дадзенай тэме сталі намеснік міністра аховы здароўя Расіі Таццяна Сямёнава і рэктар Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Аляксей Чуканаў.

Трэцяе пытанне, якое абмеркавалі спецыялісты на сумеснай калегіі, — нацыянальныя сістэмы кіравання якасцю і бяспекай медыцынскай дзейнасці. Сваё бачанне такога працэсу прадставілі генеральны дырэктар Нацыянальнага інстытута якасці Федэральнай службы па наглядзе ў сферы аховы здароўя Ігар Іваноў і дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра медыцынскіх тэхналогій, інфарматызацыі, кіравання і эканомікі аховы здароўя Міністэрства аховы здароўя Беларусі Дзмітрый Рузанаў.

Таксама беларуская дэлегацыя наведала Нацыянальны медыцынскі даследчы цэнтр нейрахірургіі імя акадэміка М. М. Бурдэнкі Міністэрства аховы здароўя Расіі.

Алена КРАВЕЦ.

Пісьменніцкія вандроўкі

ГЕРАНЁНЫ: КАМЯНІ, МАЛЬТЫЙСКІ КРЫЖ І ДВА СКАНДАЛЬНЫЯ КАХАННІ

«О Жыгімонт...
Ты помніш Геранёны
і да цябе найпершае «люблю»?!»

Пад словы Барбары Радзівіл з п'есы Раісы Баравіковай мы ўязджалі ў Геранёны.

Таямнічая, сівой даўніны мясціна, дзе пачалася самая вядомая гісторыя кахання ў беларускай гісторыі. Нездарма на гербе Геранёнаў — прабітае стралой сэрца...

ВІЗІТ ДА МАЛАДОЙ УДАВЫ

1543 год. Каралевіч Жыгімонт Аўгуст прыехаў праінспектаваць магутны замак, які пасля смерці апошняга з Гаштольдаў, Станіслава, застаўся ягонай маладой удаве Барбары Радзівіл, і вырашыць лёс спадчыны згаслага роду.

Вядома, гэты кавалак маёмасці быў прывабны і для каралевы Боны, маці Жыгімонта Аўгуста, дый шмат яшчэ для каго. Многія лічылі, што Барбара не мае ніякага права на Геранёны — жонкай была кепскай, бяздзетнай і няверная. Жаніўся на ёй Станіслаў Гаштольд па прымусе — адмовіўся ад шлюбу з яе старэйшай сястрой Ганнай з-за брудных плётак, якія пра тую хадзілі, а каб не сварыцца з Радзівіламі, мусіў пайсці да алтара з яе юнай сястрой, пра якую не мог сказаць нічога кепскага...

Вяселле было пышным, ехалі ў магутны замак, збудаваны бацькам жаніха Альбрэхтам Гаштольдам, вазы з пасагам — «парчовымі шатамі і гарнастаем, залатымі чапцамі, берэтам чырвоным аксамітным з золатам венецкай работы, шапкаю вялікай папелятай з сабалямі» ды шмат чаго іншага... У два «скарбныя вазы» было запрэжана па шэсць сівых коней, была і «кабылка» — карэта са спецыяльнай падвескай, з пазалотай і падушкамі...

Сёння наўрад ці нават тая «кабылка» праехала б да замка, бо нават дайсці няпроста. Тым больш мы, не ведаючы дарогі, пакрочылі туды ад мясцовага Дома культуры з бадзёрай мазаікай, на якой вытанцоўваюць маладзёны, а адна дзяўчына нагнулася, каб пераабуць туфлікі...

Сумняваюся, што аўтар мазаікі натхняўся вобразам Барбары Радзівіл — але чамусьці ўяўляю менавіта яе...

Пагорак спрэс зарос хмызнякамі, ды яшчэ захаваліся рэшткі абарончага рова. Геранёнскі замак, Murata Gyeranony, як называюць яго ў дакументах 1510—1523 гг., стаяў на штучным востраве, утвораным з зямлі з гэтых равоў. Перад імі быў земляны вал вышынёй 9-10 м, шырынёй каля 15 м і даўжынёй па перыметры больш за 700 м. Так што нам перапала трошкі экстрыму, пакуль дабраліся да вяршыні.

Пасля мы даведаемся, што ёсць іншая сцежка — таксама пакручастая, з выгод — толькі прымацаваная на калах жэрдачка... Затое ўнізе — шыльда з выявай колішняга замка і тэкстам пра яго.

СТАТУТ, СКАРЫНА, ПАЛЯВАННЕ...

Альбрэхт Гаштольд у 1530-м атрымаў ад імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Карла V тытул графа «з Мурауаных Геранён». Недарэмна замак узводзіўся! Праславіўся ж Альбрэхт яшчэ як сакнара ды звяглівец. Гэта ён дадаў масла ў варажнечу паміж Гаштольдамі і Радзівіламі, калі пасварыўся са сваім сябрам юнацтва Мікалаем Радзівілам. Менавіта Альбрэхту дасталася слава аўтара першага Статута Вялікага Княства Літоўскага... Праўда, гісторыкі кажуць, Статут быў ужо распрацаваны Мікалаем Радзівілам, і пасля смерці таго паперы дасталіся Альбрэхту — разам з пасадамі канцлера і ваяводы віленскага... А Гаштольд яшчэ і адмыслова зацягваў «здачу праекта», мо каб перарабіць на свой капыл, а мо таму што работа надта добра аплачвалася з казны.

Альбрэхт апекаваўся Францыскам Скарынам, далучаў яго да сваіх праектаў... Так што беларускі першадрукар, хутчэй за ўсё, бываў тут, у Геранёнах. А яшчэ Гаштольд выступаў супраць уніі з Польшчай, да апошняга адстойваў незалежнасць Вялікага Княства... Як пісалі сучаснікі, «Горды магнат з бязмернымі амбіцыямі быў шчыра прывязаны да свайго краю і не даў скарыстаць сябе як сродак чужым краінам».

Засталося ад ягонага замка няшмат. Падымаючыся, спатыкаешся аб камяні і цэглу, што сведчаць аб колішняй наяўнасці муроў. Сёння ад іх — маленькі абгрызак, ахілены ненадзейным драўляным навесам. Затое з камянёў, расцяганых з замкавых руін, збудаваны не адзін дом у акрузе.

Аглядаемся... Можна пазнаць, дзе стаялі сцены, здагадацца, дзе знаходзіліся чатыры кутнія вежы, кожная дыяметрам у восем метраў... А ці не тут стаяла брама, падымаўся мост і быў зладжаны ўпершыню ў Беларусі бастыён?

А вось палац пад абаронай магутных муроў стаяў у двары драўляны, двухпавярховы. Там і бавіла час Барбара Радзівіл... Кароль закахаўся з першага погляду. Можна ўявіць, як гожая ўдава водзіць каралевіча па доўгіх калідорах і замкавых сценах, паказваючы свае ўладанні, як яны сядзяць разам за ўрачыстым сталом, абменьваючыся поглядамі, як няўзнак датыкаецца рука да рукі... Будучы кароль — а ён, дарэчы, тады быў жанаты з нямецкай прынцэсай, дужа хворай ды брыдкай, — затрымаўся тут на некалькі тыдняў. Казаў — дзеля палявання ў тутэйшай пушчы... А праз некалькі гадоў, аўдавеўшы, насуперак усяму — уладнаў маці, волі паноў-братоў, якія катэгарычна не хацелі бачыць на польскім троне ліцвінку, звычаям, плёткам — Жыгімонт Аўгуст ажаніўся з каханай. Вяселле было не тут — у Вільні, патаемна... А тут, у Геранёнах, вянчалася Барбара з першым мужам, Станіславам Гаштольдам.

Вось і храм, дзе тое вянчанне адбылося. Касцёл Святога Мікалая, калісь узведзены тым жа Альбрэхтам Гаштольдам. Вядома, перабудаваны, і не раз, але тут ёсць камяні, якія памятаюць хаду красуні Барбары... Магутныя сцены, пафарбаваныя ў светла-жоўтае... Звяртаюць увагу дзве дэталі: на каваных варотах — мальтыйскі крыж, у сцяне — срэбная дошка як знак таго, што тут пахаваны граф Оскар Корвін-Мілеўскі, памерлы ў 1906 годзе, фундатар капліцы.

УЛАДАЛЬНІКІ ГЕРБА «СЛЕПАЎРОН»

Так, пасля смерці Барбары Геранёны і ваколіцы належалі кароне. Потым тут уладарылі Сапегі, Кішкі, Пацы... У сярэдзіне XVII стагоддзя, падчас Паўночнай вайны, замак пачаў разбурацца. У 1708 годзе тут паспеў пабываць яшчэ адзін кароль, няўдачлівы Станіслаў Ляшчынскі, а потым — заняпад... Калі Напалеон Орда замалёўваў гэтыя руіны, яны выглядалі амаль так, як і цяпер.

Як і ў той час, калі Геранёны перайшлі ва ўладанне Корвін-Мілеўскіх.

Дзіўны быў род... Прыдомак «Корвін», герб «Слепаўрон», як у венгерскіх каралёў — крумкач трымае ў дзюбе пярсцёнак. Хоць не эксклюзіў, я знайшла некалькі прозвішчаў нашай шляхты з такімі прыдомкам і гербам... Надта ганарова гучала. Корвіны — нібыта ж ад рымскіх арыстакратаў!

Геранёны дасталіся Оскару Корвін-Мілеўскаму ў пасаг ад жонкі, Веранікі Воўк-Ланеўскай. Менавіта гэты Оскар і пахаваны ў Геранёнскім касцёле.

І тут пачынаецца яшчэ адна вельмі вядомая, але трагікамічная, гісторыя кахання, звязаная з Геранёнамі.

А каб падабраць для яе адпаведныя дэкарацыі, мы адпраўляемся да маёнтка Корвін-Мілеўскіх, які знаходзіцца непадалёк. Ад яго таксама мала што засталося. Брама, якая вядзе ў закінуты парк з рэдкімі пародамі дрэў, некалькі гаспадарчых пабудоў... Затое згаданая брама на фоне накрытага туманам парку выглядае дужа гатычна.

У Оскара і Веранікі было два сыны, Ігнацый Каральі Іпаліт. Залатая моладзь... Вучыліся ў Парыжы. Іпаліт быў схільны да палітыкі, а Ігнацый — да мастацтваў. Парыж, Салоны, Манмартр, зараджэнне імпрэсіянізму... Карацей, Ігнацый вырашыў, што мусіць быць мастаком!

Бацька, натуральна, абурыўся: маёнткі вялізныя, мануфактуры, фабрыкі... Гаспадарыць трэба вучыцца! Але Ігнацый адправіўся вучыцца маляванню ў Мюнхен... Маляваў старанна, нават у парыжскім Салоне выстаўляўся... Але вялікага мастака з Ігнацыя ўсё-ткі не выйшла, расчараваўся.

Між тым, бацькі аддалі Іпаліту Лугамовічы і Лаздуны, а маёнтак у Геранёнах — Ігнацыю. І той зрабіўся мецэнатам — скупляў карціны, аддаючы перавагу сучаснаму польскаму мастацтву. Калекцыя ўтварылася багатая! Менавіта ў яго захоўвалася палатно Матэйкі — партрэт Яна Станчыка. Знакаміты блазан польскіх каралёў, які ведаў і Жыгімонта Аўгуста, і Барбару, паказаны схаваным ад тлуму, у журбе...

Бачым на ўзгорку аднанавярховую доўгую будыніну... Адрына? Стайня?

Ігнацый загадаў збудаваць побач са сваім домам у Геранёнах карцінную галерэю для сваёй калекцыі. Дом не захаваўся, але паводле некаторых крыніц карцінная галерэя — гэта і ёсць той будынак, і, магчыма, тут захоўваўся «Станчык»!

У карціны, дарэчы, дзіўны лёс... Калі Ігнацый Караль у старасці распрадаваў свае калекцыі, партрэт Станчыка выкупіў Генрык Сенкевіч, знакаміты польскі пісьменнік, аўтар «Крыжаносцаў». Але падчас Другой сусветнай вайны, калі бамбілі Варшаву, карціна загінула.

Граф дапамагаў мастакам-суайчыннікам, плаціў стыпендыі... Але ж ясна, магнат ёсць магнат. Аднойчы ўбачыў карціну Панкевіча «Кветкавы базар»... І загадаў: каб аўтар намаляваў такую самую карціну, але каб неба было на 40 сантыметраў больш, а слядоў пэндзля не заўважалася.

Ну што ж, у каго грошы, той і харошы... Панкевіч намаляваў — гладзенька і з «пашыранымі» нябёсамі.

МАЛЬТЫЙСКІ РЫЦАР, «ЛІТВА» І ЦЭЦЫЛІЯ

А Ігнацый Караль далей спраўджваў свае амбіцыі... Як і Альбрэхт Гаштольд, ранейшы ўладальнік Геранёнаў, вырашыў здабыць графскі тытул. Замка, вядома, прад'явіць не было магчымасці — адны камяні... Але грошай нямерана! Ігнацый адпраўляецца ў Рым і на матчын пасаг купляе ў Ватыкане графскі тытул — для сябе, свайго бацькі і нават для брата-палітыка, якога не дужа любіў. Наваспечаны граф мусіў тады ўступіць у Мальтыйскі ордэн, то-бок стаць мальтыйскім рыцарам. Дык вось адкуль крыжы на варотах каля касцёла Святога Мікалая! Граф і рыцар спяшаўся ўвекавечыць свой статус.

Вядома, трэба было думаць пра нашчадкаў... Не ведаю, ці сваёй воляй, ці пад прымусам радні Ігнацый ажаніўся з багатай удавой Янінай Остуг-Садоўскай. Вось толькі шлюб аказаўся бяздзетным, праз некалькі гадоў у Ватыкане яго аб'явілі несапраўдным. Пры гэтым граф лічыўся донжуанам...

А яшчэ ў графа Корвін-Мілеўскага з'явілася яхта, якую ён назваў «Літва». На гэтай яхце здзейсніў не адно падарожжа, і нават напісаў пра сваё знаходжанне ў Салавецкім манастыры кнігу — ну як кнігу, падарожныя нататкі, якія пад назвай «Дваццаць тры дні ў Ледавітым акіяне і Белым моры» былі выдадзеныя і на французскай мове ў Парыжы, і на рускай.

А яшчэ выкупіў сабе востраў у Адрыятычным моры — Святой Катарыны. Быў там у графа палац... Знайшлося і вялікае каханне — да маладой гожай натурышчыцы Цэцыліі... Была дзяўчына замужняя, але не ганарыстая. Муж, малады мастак Уладзімірскі, тут жа саступіў дарогу багатаму кліенту. Корвін-Мілеўскі абдорвае пані каштоўнасцямі, гатовы аплаціць развод... Праўда, сваёй рэпутацыі таксама шкадавата, так што стаць графіняй Корвін-Мілеўскай красуні «не свеціць».

ВЫСТРАЛ НА ВАКЗАЛЕ

А пані Уладзімірская між тым за вочы смяецца з састарэлага кавалера... А калі дзе з ім з'яўляецца, прадстаўляе яго як... свайго бацьку. Знаходзіць маладога палюбоўніка — нейкага Эмануэля Барбера. І ўрэшце на пару з ім вырашае выцягнуць з графа пабольш грошай — праз стары добры шлях шантажу. Барбер аб'яўляе графу, што мае перапіску графа з каханкай, якая пагражае кампрамацыяй. Заламіў цану...

Але Корвін-Мілеўскі — зусім не баранчык. І 29 чэрвеня 1904 года на Паўночным вакзале ў Вене, дзе бакі мусілі сустрэцца для здзелкі, граф Корвін-Мілеўскі дастае пісталет... Барбер паспрабаваў уцячы, але атрымаў кулю, на шчасце, не смяротную.

Скандал на ўсю Еўропу... Газеты паласкалі падзею, публікавалі малюнкі — вось граф, вусаты, барадаты, страляе ў спалоханага маладзёна, вось той маладзён, пухлы, з жаласнымі прайдзісвецкімі вачыма, забінтаваны, у ложку...

Пані Уладзімірская і Барбер падалі на Корвін-Мілеўскага ў суд... Але ж граф з Гамбургамі сябраваў, каву з імі піў!

Суд тут жа знаходзіць прыкметы злачынства... з боку Цэцыліі і Барбера. Яны ж яго страшэнна абразілі! Заявілі, што граф ён сумнеўны, чалавек непрыстойны, і да таго ж — увага! — спіць у труне.

Корвіны — яны ж такія, яны ж вампіры!

Цэцылія і Барбер зразумелі, што будуць бітыя, тут жа адклікалі сваю позву, абвінавацілі ва ўсім свайго адваката і зніклі.

А Корвін-Мілеўскага чакалі наперадзе Першая сусветная вайна, рэвалюцыя, страта маёмасці...

Ён памёр у 1926 годзе ў Вільні. Востраў Святой Катарыны сёння — харвацкі курорт... Дзе наўрад ведаюць пра Геранёны, якія так любіў уладальнік гэтага вострава.

Адна з адметнасцяў Геранёнаў, каля якой усе фатаграфуюцца, — назва колішняга магдэбургскага мястэчка з аб'ёмных зялёных літар... Але мне больш запомнілася іншае. Рэшткі муроў Геранёнскага замка на ўзгорку, магутныя сцены касцёла Святога Мікалая, мальтыйскія крыжы на варотах, белая брама ў спавітым туманам цёмным парку... Сюды варта прыехаць.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Прыкметы часу

МАСТАЦТВА — У МАСЫ

Як сёння змяняюцца музеі, каб мы ў іх хадзілі

Ці даўно вы апошні раз былі ў музеі? Хутчэй за ўсё, многія адкажуць: «Даўно», і, напэўна, нямала тых, хто наўрад ці зможа згадаць, калі ж быў гэты самы «апошні раз». Калі вы кожны раз, прабягаючы міма музея, кажаце сабе: «Трэба было б схадзіць», і кожны раз да канца тыдня пра гэта забываеце, вы проста не ў курсе, што сучасны музей — гэта не пыльныя экспанаты, якія «рукамі не чапаць».
Сёння гэта нешта зусім іншае.

У нашы дні музеям даводзіцца канкураваць за наведвальніка не толькі з іншымі музеямі і тэатрамі, але і з 3D-кіно, батутнымі заламі, кіберлаўнжамі, квэст-румамі... І ў першую чаргу — з гандлёвымі цэнтрамі. Менавіта туды, кажуць псіхолагі, усёй сям'ёй адпраўляецца сучасны гараджанін, каб адпачыць, як раней сем'ямі хадзілі ў кіно або тэатр. А што — светла, прыгожа, можна гуляць і любавацца, уваход бясплатны, мноства забаў плюс задавальненне ад пакупак.

БОЛЬШ НЕ «ХРАМ»?

У наш час музеям прыйшлося выйсці з вобраза «храма мастацтва», сысці з п'едэстала і навучыцца не толькі даваць веды і развіваць эстэтычны густ, але і забаўляць. Самыя знакамітыя «храмы прыгожага» адчыняюць дзверы для музычных і здымачных груп, дыджэяў і кіёскаў з ежай. Знакаміты кліп Beёнсэ The Carters Apeshit здымалі ў залах і галерэях Луўра — пасля гэтага колькасць наведвальнікаў музея выросла амаль на 30 % і пабіла сусветныя рэкорды.

Перабудоўваюць фармат работы музеі ўжо даўно — важным крокам на гэтым шляху стала ўжо традыцыйная «Ноч музеяў», якая ўпершыню прайшла ў Берліне ў 1997 годзе і была падхоплена музеямі па ўсім свеце. Сёння гэтую некалі рэвалюцыйную практыку выкарыстоўваюць нават самыя традыцыйныя музейныя ўстановы.

Вядома, наш час спарадзіў мноства музеяў, якія самі па сабе — адзін суцэльны маркетынгавы ход. Напрыклад, музей няшчаснага кахання ў горадзе Заграб (Харватыя). Людзі з усяго свету дасылаюць у яго экспазіцыю рэлівіі сваіх разбітых пачуццяў — ужо налічваюцца дзясяткі тысяч экспанатаў. Гэта плюшавыя цацкі, мабільныя тэлефоны і смартфоны, ёсць разбіты матацыкл, які пацярпеў з прычыны высвятлення адносін паміж закаханымі, мноства вясельных сукенак і заручальных кольцаў. А таксама, напрыклад, сякера, што захоўвае памяць аб расставанні двух закаханых (на шчасце, ніхто не загінуў, пашкоджаны былі толькі рэчы і мэбля). Забаўна? Магчыма. Павучальна? Напэўна. Карысна?.. Можа быць, экспазіцыя дапаможа каму-небудзь з тых, хто ў дадзены момант перажывае цяжкае расстанне. Але гаворка цяпер аб музеях у больш акадэмічным разуменні, дзе ў першую чаргу — не пра «пацікаваць», чыя экспазіцыя патрабуе ад наведвальніка некаторай інтэлектуальнай і духоўнай работы. Менавіта ад маркетынгу класічных музеяў рэаліі патрабуюць усё новых творчых ідэй — спосабаў пашырыць межы зносін з патэнцыяльным наведвальнікам без поўнага парушэння музейных традыцый.

ДЗЕ ПАЧЫНАЕЦЦА КАМУНІКАЦЫЯ

— Музей балансуе на скрыжаванні некалькіх плоскасцяў. З аднаго боку, гэта вывучэнне сусветнай культурнай спадчыны, навуковы інстытут. Але з іншага, музей не мае ніякага сэнсу без наведвальнікаў — тых, хто будзе атрымліваць усе гэтыя паведамленні. Мы стараемся вытрымліваць гэты баланс і асноўную задачу бачым у тым, каб не скаціцца ні ў адну з крайнасцяў, — кажа **загадчыца сектара маркетынгу Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Святлана ВАРАПАЙ.** — У тым ліку ў масмаркет. Як бы музей ні стараўся быць бліжэй да наведвальніка, усё роўна гэта нешта элітарнае.

Дарэчы, прыклад выключна ўдалага сумяшчэння элітарнасці са штодзённасцю — калекцыя ахоўных масак, якія з'явіліся ў продажы ў сувенірнай краме Нацыянальнага мастацкага музея ў кастрычніку гэтага года. У калекцыю ўвайшло пяць масак з фрагментамі знакамітых карцін — у аснову ляглі дзве работы Ілы Машкова, карціны Язэпа Драздовіча і Даніэля Сегерса, а таксама фрагмент японскага пояса обі XIX стагоддзя з Усходняй калекцыі. Аб гэтых масках пісалі ў СМІ і сацсетках, за імі не ленаваліся спецыяльна заехаць у сувенірны кіёск музея. Прытым, што цана на іх вышэйшая, чым на звычайную медыцынскую маску прыкладна ў сем разоў.

— Маска — неад'емны атрыбут нашай рэальнасці, без яе ў нашы дні не выйсці з дому, дык чаму б не зрабіць яе яркай дэталлю вобраза?

Калекцыя масак, як і іншая прома-прадукцыя музея (сумкі-шоперы і майкі, маскі для сну, паяскныя сумкі з фрагментамі карцін з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея, а таксама іншых сусветных шэдэўраў) — вынік супрацоўніцтва музея з дызайнерам Лёшам Лімонавым і Shuba Gift Factory. У кожнага вырабу ад Shuba Gift Factory, які прадстаўлены ў краме, ёсць этыкетка, дзе можна прачытаць, што гэта за твор і ў якім музеі ён знаходзіцца.

— З керамістамі мы актыўна працуем, у прыватнасці, з нашай Усходняй калекцыяй. Напрыклад, вось кубак з фрагментамі роспісу японскага куфра. Акрамя буйных дэталяў, там ёсць шмат маленькіх герояў, на якіх многія наведвальнікі не звяртаюць увагі. Між тым, яны гэтай увагі вартыя — і мы вырашылі іх павялічыць, паказаць вось такім чынам, — тлумачыць галоўны маркетолаг Нацыянальнага мастацкага.

Самыя розныя рэчы з сувенірнага кіёска адсылаюць пакупніка да знакамітых палотнаў — напрыклад, «Жаночага партрэта» Ілы Машкова, работ Шагала і Малевіча.

— Палічка, прысвечаная Малевічу, ужо апусцела, многае разабралі за выхадныя, — тлумачыць суразмоўніца. — А гэта — упрыгажэнні, натхнёныя супрэматычнымі кампазіцыямі Надзі Лежэ, што таксама ёсць у калекцыі нашага музея.

Разлік просты — чалавек, набыўшы прыгожую рэч з рэпрадукцыяй або дэталлю мастацкага твора, верагодна, захоча ўбачыць прататып.

— Музейны «мерч» — гэта ўжо не нешта факультатыўнае. Гэта чакана. Людзі чакаюць, што ў музеі ёсць сувеніры, якія яны змогуць купіць. Гэта не столькі пра прыбытак, колькі пра збліжэнне. Музею важна ўмець чуць і адгукацца на тое, што адбываецца навокал.

Сувенірныя крамы (і іх асартымент), таксама як і кавярні, — прасторы, дзе людзі маюць зносіны за межамі калекцый і славутасцяў, — сёння пры правільнай маркетынгавай стратэгіі становяцца сімваламі музея. Напрыклад, Лонданскі музей Віктарыі і Альберта адкрыў першую ў свеце кавярню-музей яшчэ ў 1856 годзе, і сёння гэта культавае месца і яго сімвал. Але ў цэлым музейны маркетынг — гэта ў першую чаргу не пра продажы, кажа Святлана.

— Музейны маркетынг належыць хутчэй да музейнай камунікацыі. Гэта той тэрмін, які мы з калегамі любім больш за ўсё, які нам здаецца самым дакладным у апісанні нашай работы. І камунікацыя пачынаецца не ў самім музеі, не каля яго дзвярэй. Яна пачынаецца значна далей — на сайце

Сумкі-шоперы і майкі, маскі для сну, паяскныя сумкі з фрагментамі карцін з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея, а таксама іншых сусветных шэдэўраў — вынік супрацоўніцтва музея з дызайнерам Лёшам Лімонавым і Shuba Gift Factory.

музея, у пошукавым запыце, у сацсетках і знадворнай рэкламе па горадзе. Яна працягваецца ў прасторы музея, і любая рэч, якая адносіцца да сэрвісу, да гасціннасці, — таксама частка музейнай камунікацыі. Тое, як чалавек адчувае сябе ў музеі, таксама нясе ў сабе вельмі важныя сэнсы.

СЭЛФІ, КВЭСТЫ І ДАПОЎНЕНАЯ РЭАЛЬНАСЦЬ

Такім чынам, каб выжыць у суровай канкурэнтнай барацьбе, музеям важна ісці ў нагу з часам. Што ж *можна* ў сучасным музеі?

● **Фатаграфаваць і рабіць сэлфі**

Калі вам ужо «крыху за трыццаць», вы памятаеце час, калі ў музеях забаронены былі фота- і відэаздымка. Але сучасны чалавек любіць дзяліцца ўражаннямі, і забарона на фота і відэа, безумоўна, выкліча негатыў. Музейныя супрацоўнікі кажуць аб тым, што прастора музеяў сёння павінна стаць даступнай, зручнай для наведвальніка, нават... «інстаграмнай».

— Падлеткі — тая аўдыторыя, да работы з якой мы заўсёды пэўным чынам настройваемся, — расказвае Святлана Анатольеўна. — Кожны раз гэта выклік для экскурсавода: знайсці правільныя аналогіі. Каб падлеткавая аўдыторыя змагла зразумець кантэкст, у якім была напісана карціна, аналогію важна правесці з тымі паняццямі, якія ім блізкія. Напрыклад, праводзіўся дзень музейнага сэлфі, у яго рамках праходзілі лекцыі пра тое, як пераклікаюцца сэлфі і аўтапартрэт, а таксама воркшопы, як зрабіць

Паштоўкі з рэпрадукцыямі твораў мастацтва. Самая дарагая каштуе два рублі.

высокамастацкае сэлфі на мабільны тэлефон. Падобных праектаў у нас шмат.

Так што здымаць у музеях сёння дазволена (толькі адключыце ўспышку). Галоўнае, каб мэтай візіту быў агляд экспазіцыі, а не фотасесія.

● **Адчуць магчымасці лічбавых тэхналогій**

Інструменты музейнай камунікацыі змяняюцца разам з запытамі наведвальнікаў. Яшчэ пару гадоў таму музеям дастаткова было проста мець сайт-візітоўку. Сёння ствараюцца цэлыя парталы, дзе самым значным творам мастацтва з фондаў прысвечаны асобныя сайты. Выкарыстоўваюцца лічбавыя гіды па музейных залах, спецыяльна распрацаваныя дадаткі для смартфонаў, віртуальныя экскурсіі, якія можна наведаць, не ўстаючы з канапы. Напрыклад, Нацыянальны гістарычны музей яшчэ ў 2017 годзе даў наведвальнікам магчымасць падняцца на сцены віртуальна адноўленых Крэўскага і Гальшанскага замкаў. «Эфект прысутнасці» забяспечвалі акуляры дапоўненай рэальнасці. А ў Літаратурным музеі Янкі Купалы гэтак жа гадоў пяць таму ў кабінеце беларускага класіка з'явілася галаграма — аб'ёмная выява, якая паказвае Купалу за работай.

І, вядома, сучаснаму музею неабходныя прамыя зносіны са сваёй аўдыторыяй праз сацыяльныя сеткі. З іх дапамогай публіка даведваецца аб мерапрыемствах, якія праходзяць або адбудуцца ў хуткім часе. А музей — атрымлівае зваротную сувязь.

— Мы пастаянна вывучаем водгукі. Гэта дазваляе паглядзець на музей вачыма наведвальнікаў і зразумець іх матывацыю, — кажа кіраўнік сектара маркетынгу Нацыянальнага мастацкага музея.

● **Плаціць менш**

Сёння музеі актыўна працуюць з такімі катэгорыямі, як дзеці і пенсіянеры. У многіх музеях свету для пажылых людзей распрацоўваюцца спецыяльныя праграмы і маршруты па музейных залах, у стварэнні такіх праектаў бяруць актыўны ўдзел валанцёры старэйшага ўзросту.

— У нас ёсць дадатковы льготны дзень для людзей пенсійнага ўзросту. І таксама льготны дзень для ўсіх — гэта апошняя серада кожнага месяца, калі кошт квітка складае 50 % звычайнага, — распавядае суразмоўніца.

● **Бегаць па музейных залах і ўдзельнічаць у квэстах**

Квэсты праводзяцца ў многіх музеях свету, у тым ліку і ў беларускіх. Нацыянальны гістарычны музей, напрыклад, яшчэ пяць гадоў таму стварыў мабільную праграму, каб удзельнікам было зручней праходзіць заданні. Ёсць квэсты, разлічаныя на дарослых, але ў першую чаргу гэта форма ўзаемадзеяння з моладдзю, падлеткамі і дзецьмі. Сёння музеі фарміруюць сваю аўдыторыю практычна з першых гадоў жыцця.

— Мы стараемся распрацоўваць праграмы і экскурсіі для дзяцей так, каб малога не трэба было сілком весці за руку ў музейныя залы і «запіхваць» у яго веды. Шмат дзяцей прыходзіць у музей упершыню, і гэта вельмі адказна. Таму з імі мы працуем у інтэрактыўных фарматах. Элементы гульні і квэсты, калі трэба прабегчы па ўсіх залах і знайсці карціну па фрагменце, які ў цябе на картцы, разгадаць загадку, — усё гэта пагружае дзіця ў атмасферу музея. У канцы інтэрактыўных праграм дзецям прапануецца зрабіць арт-аб'ект уласнымі рукамі: далучыцца да мастацтва арыгамі, распісаць талерку або самому стварыць пацеркі з палімернай гліны. Часта дзеці ходзяць класамі, ад школ. Але цяпер становіцца больш бацькоў, якія выбіраюць для сваіх дзяцей музей як від вольнага часу. І гэта вельмі прыемна.

● **Уцячы ад шэрай штодзённасці**

Адна з мэт, з якой людзі наведваюць музей, кажа Святлана Анатольеўна, — магчымасць апынуцца ў іншай рэальнасці, не падобнай на звыклую руціну.

— Наведвальнікаў мы ацэньваем, зыходзячы з іх матывацыі — на мой погляд, гэта больш інфарматыўна, чым сацыяльныя і дэмаграфічныя зрэзы: узрост, пол, прафесія. Важней тое, чаму чалавек прыйшоў у музей. Многія прыходзяць, каб перазагрузіцца. Адключыцца ад сваіх клопатаў, уцячы ад праблем. Іншыя мэтанакіравана ходзяць на нашы лекцыі, сустрэчы з рэстаўратарамі, кураторамі выставак. Гэтыя людзі імкнуцца атрымаць новыя веды, і гэта больш глыбокі ўзровень уключэння. Ёсць сямейны наведвальнік, які перадае дзецям свае веды аб свеце ў нашых сценах. Для некага паход у музей становіцца спосабам зблізіцца, аб'яднацца. Музей можа даць такія ўражанні, якія не дасць ні кінатэатр, ні гандлёвы цэнтр, ні батутная арэна. Гэта нешта зусім асаблівае. Тут можна выдатна правесці час — і гэты час будзе непадобны ні на што іншае.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,
фота аўтара.

белагропромбанк

БЕЛКАРТ

Правила проведения РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «100 000 на мечту!»

1. Наименование рекламной игры

Настоящая рекламная игра называется «100 000 на мечту!» (далее – Игра), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее – Правила) согласно требованиям законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры дополнительной платы.

2. Сведения об Организаторе

2.1. Организатором Игры является Общество с ограниченной ответственностью «Мятный знак», УНП 192325716, зарегистрировано 20 августа 2014 г. решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192325716 (далее – Организатор).

2.2. Юридический адрес и местонахождение Организатора: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Октябрьская, 19Б, оф. 6, этаж 3.

2.3. Заинтересованным лицом Игры является Открытое акционерное общество «Банковский процессинговый центр».

3. Территория проведения Игры

Игра поводится на территории Республики Беларусь.

4. Период проведения Игры

Игра проводится в период с 15.12.2021 по 19.04.2022, включая период розыгрышей и вручения призов.

5. Комиссия по проведению Игры

5.1. Для контроля за ходом Игры создается Комиссия по ее проведению. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения Игры. Комиссия состоит из Председателя и 4 членов.

Председатель Комиссии:

Никифорова Ольга Александровна – директор ООО «Мятный знак».

Члены комиссии:

Богдан Лидия Владимировна – заместитель директора ООО «Мятный знак»;

Воробьева Дарья Александровна – начальник управления маркетинга и развития платежной системы БЕЛКАРТ ОАО «Банковский процессинговый центр»;

Веренич Иван Владимирович – ведущий специалист отдела маркетинга ОАО «Банковский процессинговый центр»;

Шавеко Елена Владимировна – начальник отдела маркетинга ОАО «Банковский процессинговый центр».

Комиссия осуществляет контроль за соблюдением установленных Правил проведения Игры, рассматривает возникшие жалобы и предложения со стороны участников Игры.

5.2. Члены комиссии обязаны осуществлять возложенные на них полномочия в течение срока проведения Игры.

6. Наименование товаров (работ, услуг) или их групп, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра.

6.1. Игра проводится в целях стимулирования проведения безналичных платежей с использованием банковских платежных карточек БЕЛКАРТ, эмитированных ОАО «Белагропромбанк» (далее – карточки БЕЛКАРТ), в том числе в рамках пакета «Забота» (далее – Пенсионные карточки БЕЛКАРТ).

6.2. При использовании в Правилах термина «банковская платежная карточка» используется в значении, определенном статьей 273 Банковского кодекса Республики Беларусь: «Банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь».

7. Участники Игры.

7.1. Участниками Игры являются физические лица – держатели карточек БЕЛКАРТ/Пенсионных карточек БЕЛКАРТ.

7.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, а также Члены комиссии.

8. Состав и размер призового фонда

Призовой фонд Игры формируется за счет денежных средств Заинтересованного лица.

Общий размер призового фонда составляет 237 328,08 (двести тридцать семь тысяч триста двадцать восемь) белорусских рублей 08 копеек.

Таблица 1.

№ п/п	Наименование призов, участвующих в розыгрыше	Название приза далее в Правилах	Кол-во (шт.)	Стоимость за 1 ед., белорусских рублей	Всего стоимость, белорусских рублей
1	Денежный приз 100 000 BYN	Главный приз	1	100 000,00	117 867,36
	Денежная сумма для оплаты комиссии банка			2 564,10	
	Денежная сумма для оплаты подоходного налога			15 303,26	
2	Денежный приз 3 000 BYN	Приз № 1	9	3 000,00	31 628,52
	Денежная сумма для оплаты комиссии банка			76,92	
	Денежная сумма для оплаты подоходного налога			437,36	
3	Денежный приз 1 000 BYN	Приз № 2	30	1 000,00	34 694,40
	Денежная сумма для оплаты комиссии банка			25,64	
	Денежная сумма для оплаты подоходного налога			130,84	
4	Денежный приз 500 BYN	Приз № 3	45	500,00	25 516,80
	Денежная сумма для оплаты комиссии банка			12,82	
	Денежная сумма для оплаты подоходного налога			54,22	
5	Денежный приз 800 BYN	Приз «Забота»	30	800,00	27 621,00
	Денежная сумма для оплаты комиссии банка			20,51	
	Денежная сумма для оплаты подоходного налога			100,19	

9. Условия участия в Игре.

9.1. Для участия в Игре физическому лицу необходимо:

9.1.1. Стать держателем карточки БЕЛКАРТ/Пенсионной карточки БЕЛКАРТ в период с 15.12.2021 по 08.03.2022.

9.1.2. В период с 15.12.2021 по 08.03.2022 включительно совершать с использованием карточки БЕЛКАРТ/Пенсионной карточки БЕЛКАРТ безналичные операции (транзакции) на территории Республики Беларусь по оплате (приобретению) товаров/работ/услуг в организациях торговли (сервиса) на территории Республики Беларусь, а также операции в сети Интернет, за исключением операций, указанных в п. 9.6 Правил.

9.1.2.1. В розыгрыше призов «Приз № 1», «Приз № 2», «Приз № 3» участвуют участники, совершившие безналичные операции с использованием карточки БЕЛКАРТ/Пенсионной карточки БЕЛКАРТ в периоды, указанные в Таблице 2 Правил, на общую сумму не менее 300,00 (Триста) белорусских рублей 00 копеек.

9.1.2.2. В розыгрыше приза «Главный приз» участвуют участники, совершившие безналичные операции с использованием карточки БЕЛКАРТ/Пенсионной карточки БЕЛКАРТ в период с 15.12.2021 по 08.03.2022 включительно на общую сумму не менее 1 000,00 (Одна тысяча) белорусских рублей 00 копеек.

9.1.2.3. В розыгрыше приза «Приз «Забота» участвуют участники, совершившие безналичные операции с использованием Пенсионной карточки БЕЛКАРТ в периоды, указанные в Таблице 2 Правил, на общую сумму не менее 300,00 (Триста) белорусских рублей 00 копеек.

9.1.3. Дать согласие на участие в Игре, на обработку своих персональных данных ОАО «Белагропромбанк», а также согласие на передачу Организатору информации, составляющей банковскую тайну. Согласия выражаются участником Игры при заключении договора текущего (расчетного) банковского счета, к которому выпускается карточка БЕЛКАРТ/Пенсионная карточка БЕЛКАРТ, или при получении карточки БЕЛКАРТ/Пенсионной карточки БЕЛКАРТ.

9.2. Соблюдать нормы законодательства Республики Беларусь и правила пользования банковскими платежными карточками, установленными Банком-эмитентом.

9.3. Участник может принимать участие в Игре неограниченное число раз, заново совершая действия, указанные в п. 9.1 Правил.

9.4. Участнику Игры, соответствующему требованиям п. 9.1 Правил, перед розыгрышем присваивается Номер участника согласно п. 10.5 Правил.

9.5. За каждое выполнение пп. 9.1.2.1, 9.1.2.2 или 9.1.2.3 Правил Участнику Игры присваивается Номер участника для участия в розыгрыше.

Например, Участник Игры, совершивший с использованием карточки БЕЛКАРТ безналичные операции, соответствующие Правилам, в один из периодов, указанных в Таблице 2 Правил, на общую сумму 1 000,00 (Одна тысяча) белорусских рублей 00 копеек, получает 3 (три) Номера участника для участия в соответствующем розыгрыше призов «Приз № 1», «Приз № 2», «Приз № 3» и 1 (один) Номер участника для участия в розыгрыше приза «Главный приз».

9.6. Не являются основанием для участия в Игре:

- безналичные операции, совершенные ранее 00:00:00 15.12.2021 и позднее 23:59:59 08.03.2022;
- операции по снятию наличных денежных средств или пополнению карт-счета;
- операции по переводу денежных средств с одной банковской платежной карточки на другую банковскую платежную карточку;
- операции по оплате коммунальных услуг;
- операции по размещению (пополнению) вкладов (депозитов);
- операции по оплате кредитных обязательств и банковских комиссий;
- операции по оплате налогов, штрафов, взносов, обязательных государственных пошлин.

10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда

10.1. Место проведения розыгрышей – г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/2-417.

10.2. Розыгрыш призового фонда проводится открыто с возможностью присутствия на нем участников Игры. Результаты розыгрыша Игры не должны зависеть от воли Организатора и не могут быть никем специально устроены.

10.3. Всего за период проведения Игры проводится 4 (четыре) розыгрыша призового фонда согласно Таблице 2 Правил, в ходе которых победители определяются из числа участников Игры, выполнивших все условия настоящих Правил.

Таблица 2.

Розыгрыш №	Дата и время розыгрыша	Период совершения безналичных операций	Участвуют безналичные операции, совершенные по банковским платежным карточкам	Призовой фонд для каждого розыгрыша
1	21.01.2022 в 12.00	с 15.12.2021 по 11.01.2022 включительно	Карточка БЕЛКАРТ/ Пенсионная карточка БЕЛКАРТ	Приз № 1 – 3 шт. Приз № 2 – 10 шт. Приз № 3 – 15 шт.
			Пенсионная карточка БЕЛКАРТ	Приз «Забота» – 10 шт.
2	18.02.2022 в 12.00	с 12.01.2022 по 08.02.2022 включительно	Карточка БЕЛКАРТ/ Пенсионная карточка БЕЛКАРТ	Приз № 1 – 3 шт. Приз № 2 – 10 шт. Приз № 3 – 15 шт.
			Пенсионная карточка БЕЛКАРТ	Приз «Забота» – 10 шт.
3	18.03.2022 в 12.00	с 09.02.2022 по 08.03.2022 включительно	Карточка БЕЛКАРТ/ Пенсионная карточка БЕЛКАРТ	Приз № 1 – 3 шт. Приз № 2 – 10 шт. Приз № 3 – 15 шт.
			Пенсионная карточка БЕЛКАРТ	Приз «Забота» – 10 шт.
4	18.03.2022 в 13.00	с 15.12.2021 по 08.03.2022 включительно	Карточка БЕЛКАРТ/ Пенсионная карточка БЕЛКАРТ	Главный приз – 1 шт.

10.4. Призовой фонд разыгрывается в последовательности, указанной в Таблице 2 настоящих Правил.

10.5. Для проведения розыгрыша призового фонда Организатором формируются списки из участников Игры, выполнивших условия настоящих Правил (далее – Списки):

- для розыгрыша № 1: Список для розыгрыша призов «Приз № 1», Приз № 2», «Приз № 3» и Список для розыгрыша приза «Приз «Забота»;
- для розыгрыша № 2: Список для розыгрыша призов «Приз № 1», Приз № 2», «Приз № 3» и Список для розыгрыша приза «Приз «Забота»;
- для розыгрыша № 3: Список для розыгрыша призов «Приз № 1», Приз № 2», «Приз № 3» и Список для розыгрыша приза «Приз «Забота»;
- для розыгрыша № 4: Список для розыгрыша приза «Главный приз».

В каждом Списке Участнику присваивается порядковый номер (далее – Номер участника), согласно фамилии, имени, отчеству (при наличии) участников по алфавиту. В случае совпадения у нескольких участников фамилии, имени, отчества (при наличии) Номера участников присваиваются по последним 4 (четырем) цифрам номера карточки БЕЛКАРТ/Пенсионной карточки БЕЛКАРТ участников по возрастанию.

Все Номера участников для каждого розыгрыша имеют одинаковую разрядность.

10.5.1. Каждый Список для розыгрыша призов содержит следующую информацию: Номер участника, фамилию, имя, отчество (при наличии) участника, последние 4 (четыре) цифры номера карточки БЕЛКАРТ/Пенсионной карточки БЕЛКАРТ участника.

10.6. Для проведения каждого розыгрыша используются лототрон и набор шаров в количестве 10 (десяти) штук с цифрами от 0 (нуля) до 9 (девяти) включительно. Определение выигрышных Номеров участников происходит путем их формирования слева направо из цифр в шарах, поочередно извлекаемых из лототрона.

10.6.1. Для определения цифры первого слева разряда выигрышного Номера участника в лототрон помещаются шары с цифрами от 0 (нуля) до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего по порядку номера в Списке. Член комиссии извлекает из лототрона один шар. Цифра из извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного Номера участника.

10.6.2. Далее в лототрон загружаются все десять шаров. Шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, цифра в котором определяет цифру следующего разряда выигрышного Номера участника. Производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах Номеров участников. При наличии совпадения цифра вытянутого шара записывается в соответствующий разряд выигрышного Номера Участника – и шар возвращается в лототрон; в противном случае извлеченный шар с цифрой не возвращается в лототрон, и Член комиссии извлекает следующий шар до получения нужного совпадения.

10.6.3. Шары извлекают до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон цифр соответствующих разрядов Номеров участников в Списке. Таким образом формируются все выигрышные Номера участников в каждом Списке.

10.7. Участник может выиграть только один из призов «Приз № 1», «Приз № 2», «Приз № 3» в одном соответствующем розыгрыше. В случае если выигрышным становится Номер участника, принадлежащий участнику, уже выигравшему один из призов в текущем розыгрыше, выигрышным признается следующий по Списку Номер участника другого участника. При этом, участник, являющийся держателем Пенсионной карточки БЕЛКАРТ, продолжает принимать участие в розыгрыше приза «Приз «Забота».

10.8. При проведении каждого розыгрыша дополнительно определяются по одному резервному победителю для каждого приза. Резервным победителем становится следующий за выигрышным по Списку Номер участника, принадлежащий другому участнику.

10.9. Результат каждого розыгрыша в обязательном порядке фиксируется в протоколе, который подписывается присутствующими на заседании членами комиссии по проведению Игры.

11. Срок и способ информирования Победителей розыгрыша призового фонда. Место, порядок и срок выдачи выигрышей.

11.1. Организатор уведомляет Победителей/Резервных победителей о выигрыше приза/призов «Приз № 1», «Приз № 2», «Приз № 3», «Приз «Забота» (далее – Приз) или Главного приза по телефону и письменно заказным письмом с уведомлением в сроки, указанные в Таблице 3.

11.2. Для получения Приза или Главного приза Победитель/Резервный победитель не позднее сроков, установленных в Таблице 3 настоящих Правил, должен выслать Организатору на электронную почту 3355110@tut.by следующую информацию:

- копию страницы 25, страниц 31–33 паспорта – для граждан Республики Беларусь;
- копию страницы 3, страниц 15–17 вида на жительство – для лиц, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь;
- заявление/выписку об открытии текущего (расчетного) банковского счета, к которому выпускается карточка БЕЛКАРТ/Пенсионная карточка БЕЛКАРТ, на который будет перечисляться сумма приза.

11.3. Организатор перечисляет Призы и Главный приз (за вычетом денежной суммы для оплаты подоходного налога) Победителю/Резервному победителю на текущий (расчетный) банковский счет, открытый на имя Победителя/Резервного победителя, к которому выпускается карточка БЕЛКАРТ/Пенсионная карточка БЕЛКАРТ, в сроки, указанные в Таблице 3 Правил.

Таблица 3

Розыгрыш №	Сроки уведомления о выигрыше	Сроки отправки Организатору, необходимых документов, указанных в п. 11.2 Правил	Сроки перечисления Призов/ Главного приза
1	Основные победители		
	по 28.01.2022 включительно	по 02.02.2022 включительно	по 07.02.2022 включительно
	Резервные победители		
	в течение 2 (двух) дней со дня определения Победителем Приза, но не позднее 12.02.2022	по 17.02.2022 включительно	по 22.02.2022 включительно
2	Основные победители		
	по 25.02.2022 включительно	по 02.03.2022 включительно	по 09.03.2022 включительно
	Резервные победители		
	в течение 2 (двух) дней со дня определения Победителем Приза, но не позднее 17.03.2022	по 22.03.2022 включительно	по 28.03.2022 включительно
3, 4	Основные победители		
	по 25.03.2022 включительно	по 30.03.2022 включительно	по 04.04.2022 включительно
	Резервные победители		
	в течение 2 (двух) дней со дня определения Победителем Приза/ Главного приза, но не позднее 09.04.2022	по 14.04.2022 включительно	по 19.04.2022 включительно

11.4. Призы и Главный приз перечисляются Резервным победителям в случае, если основной Победитель:

- отказался от получения Приза/Главного приза, о чем письменно известил Организатора Игры, по адресу 220030, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Октябрьская, 19Б, оф. 6, этаж 3;
- нарушает (не выполняет) условия Правил, в том числе не предоставил необходимые документы, указанные в Правилах, в сроки и в порядке, установленные Правилами;
- не выходит на связь с Организатором в сроки и в порядке, установленные Правилами.

11.5. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводятся в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь, и осуществляются Организатором. Удержание с Победителей/Резервных победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в день перечисления Призов/Главного приза Победителям/Резервным победителям из денежной суммы для оплаты подоходного налога приза (денежная сумма удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере).

12. Права и обязанности участников Игры.

12.1. Принимая участие в Игре, участники подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования Правил и законодательства, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением Призов и Главного приза.

12.2. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них без уплаты им какого-либо вознаграждения могут быть использованы Организатором в целях проведения данной Игры. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

12.3. Победители/Резервные победители, претендующие на получение Призов и Главного приза, обязуются предоставить всю необходимую информацию для их получения и выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности, необходимые для получения выигранных призов.

13. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил и результатов розыгрыша, сроки публикации.

13.1. Правила Игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Игры.

13.2. Результаты розыгрышей Игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 15.04.2022.

14. Порядок предоставления информации по вопросам проведения Игры.

14.1. Все возможные вопросы и претензии участников в отношении организации и условий передачи призов должны быть адресованы Организатору Игры по адресу: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Октябрьская, 19Б, оф. 6, этаж 3.

14.2. Информацию об условиях участия и проведения Игры можно получить по телефону 8 029 385 51 10 ежедневно с 10.00 до 17.00, а также на сайте https://bapb.belkart.by.

15. Общие положения.

15.1. Организатор не вступает в споры между участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.

15.2. Организатор не несет ответственности за качество работы почтовых служб, в частности за недоставку либо несвоевременную доставку почтовой корреспонденции.

Свидетельство № 4123 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 8 декабря 2021 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Трыялогія

ЯК МАКСІМ БАГДАНОВІЧ СТАЎ «МУЛЬЦЯШНЫМ» ГЕРОЕМ І НАВОШТА ДЗЕЦЯМ ЖАХАЛКІ

Дыскусія пра дзіцячае кіно

Падчас нядаўняга фестывалю «Лістапад» адбыўся і чарговы конкурс стужак для дзяцей і юнацтва — «Лістападзік»... Чым не падстава пагаварыць пра дзіцячае кіно? Тым больш яно для Беларусі — пазнавальны брэнд.
Таму сёння ў рубрыцы «Трыялогія» дыскутуюць кінарэжысёр-мультыплікатар, сцэнарыст, акцёр Аляксандр Ленкін, які быў сябрам журы фестывалю «Лістападзік», рэжысёр, сцэнарыст, пісьменніца Алена Турава, чыім анімацыйным мюзіклам «Зоркі сёмага неба» адкрывалася праграма сёлетняга «Лістападзіка», ну і традыцыйная, пісьменніца Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

«ВОЎК, ДАСТАНЬ З ЗУБОЎ ЦЫГАРЭТУ!» ПРА ХАНЖАСТВА І ТАБУ

Л. Рублеўская. Мусіць, галоўная праблема, з якой сустракалася мастацтва для дзяцей у розныя эпохі — табуіраванне пэўных тэм. У 1930-м у ЗША забаранілі мультфільм пра Мікі Маўса, у якім паказалі голае вымя каровы, у 1970-х у Савецкім Саюзе лёг на паліцу мультфільм «Лямзі-Тыры-Бондзі» па сцэнарыі Людмілы Петрушэўскай, бо там апавядалася пра беспрытульніка. Сёння ў свеце дэкларуецца падзенне ўсіх табу. Для дзяцей пішуць кнігі пра смерць і пра секс, пра развод бацькоў і нетрадыцыйную арыентацыю... Ёсць і абураныя: маўляў, рана такое дзецям, няма чаго траўміраваць несфарміраваную псіхіку. У сваім прафесійным досведзе вы сутыкаліся з нейкімі табу?

А. Ленкін. Не сустракаўся. На «Лістападзіку» падымаюцца самыя розныя вострыя тэмы...

Е. Турава. Сёння, наадварот, сустракаецца табуіраванне самых бяскрыўдных рэчаў. Калі мультфільму «Ну, пачакай!» паставілі катэгорыю «18+», для мяне гэта быў шок. Я вырасла на гэтым мультфільме. Тое, што ў Ваўка цыгарэта ў зубах, не значыць, што дзіця з-за гэтага адразу пачне курыць. У нашым фільме «Зоркі сёмага неба» ёсць эпізод з адмоўным персанажам: ён хуліган, нядобры, курыць цыгарэту... І ў гэтым сюжэце тлумачыцца, чаму курыць дрэнна, станоўчы герой тую цыгарэту топча... І вось узнікла пытанне: як жа даваць гэтаму фільму катэгорыю «6+», калі там цыгарэта ў кадры? Сябры, а як паказаць, што цыгарэта — дрэнна, калі мы яе ўвогуле не ўбачым? Даходзіць да абсурду. Мой улюбёны мульцік быў пра Карлсана. І кніжкай пра яго зачытвалася. У Швецыі гэты герой Ліндгрэн лічыцца не вельмі добрым персанажам, яго часам нават забаранялі. Але я не палезла пасля прачытання гэтай кнігі на дах, не крала ўстаўныя зубы свайго дзядзечкі са шклянкі... Гэта вясёлая, жыццярадасная казка. А пачытайце фальклор... Дзве сястры і брацік пайшлі збіраць ягадкі, брацік назбіраў больш, сястрычкі кажуць — давай яго заб'ём... Гэта фалькларысты пасля адаптавалі народныя сюжэты, але ў іх усё адно засталося шмат жорсткасці. Але тое не значыць, што дзеці, слухаючы гэтыя казкі, вырасталі злачынцамі.

Л. Р. То-бок усё адно засталося ханжаства, якое забараняе «Муху-Цакатуху», таму што там праслаўляецца кулацтва ў выглядзе жукоў рагатых — мужыкоў багатых, з другога боку, дэкларуецца, што з дзецьмі трэба гаварыць пра ўсё... У вас, Аляксандр Адольфавіч, ёсць цудоўны мультфільм «Дзед» на аснове беларускай народнай казкі, там даволі цяжкая тэма — пра старасць, смерць... Не казалі вам, што гэта залішне складана для дзяцей?

А. Л. Не, не казалі. А каб і сказалі, я проста б пасмяяўся. Гэта значыла б, што такі чалавек нічога не разумее ні ў мастацтве, ні ў кіно, ні ў жыцці. На «Лістападзіку» перамог мультфільм «Нават мышы трапляюць у рай» Яна Бубенічка і Дэнізы Грымавай — пра тое, як памерлі мышаня і ліс, і што іх чакала на тым свеце... Дзеці былі ў захапленні.

Л. Р. Але ці ўсё дазволена ў гутарцы аўтара і дзіцяці? Ці павінны быць нейкія межы?

А. Л. Вядома.

А. Т. Але і забараняць усё нельга! Павінна быць разумная мяжа!

А. Л. Трэба ўлічваць, што дзіця яшчэ расце, што яно не гатовае да нейкіх рэчаў. У кожным узросце — свае ўласцівасці псіхікі, не кажучы пра тое, што дзеці самі па сабе розныя. Нехта расце ў нармальнай, паўнавартаснай сям'і, нехта — у сям'і алкаголікаў, нехта — у дзіцячым доме. Але ўсе гэтыя табуіраванні, «0+», «6+» — вельмі ўмоўныя, калі я рос, такога не было. Потым некаму ўздумалася заганяць усё ў нейкія рамкі. А гэта, акрамя непаразуменняў, нічога не выклікае. Людзі з увядзеннем гэтай маркіроўкі не змяніліся, у кожнага засталіся свае маральныя арыенціры.

КІЧ І БАНАНАВАЯ СКУРКА ЧАПЛІНА

Л. Р. Што ж, праўда, у кожнага свае крытэрыі... Вось вы, Аляксандр Адольфавіч, аднойчы сказалі, што «Ну, пачакай!» — гэта кіч... Што такое кіч у дзіцячым кінематографе? Інсітнае, наіўнае мастацтва прызнанае высокім, прызнана, што дзіцячы малюнак мае мастацкую каштоўнасць... Як жа ўзнікае кіч? У імкненні прыпадобніцца да дзіцяці, сюсюканні з ім? У імкненні пераймаць нейкія ідэалагічныя клішэ?

А. Л. Кіч — гэта калі гісторыя «лабавая», немудрагелістая, выказаная прымітыўнымі візуальнымі сродкамі. Калі пасля прагляду не ўзнікае сур'ёзных высноў.

Л. Р. Ну добра, калі «Ну, пачакай!» — кіч, «Том і Джэры» — што? Яшчэ большы кіч? Ёсць жа меркаванне, што «Ну, пачакай!» — гэткі савецкі адказ «Тому і Джэры», як «Залаты ключык» — рымейк гісторыі пра Пінокіа, а «Чараўнік Смарагдавага горада» — «Чараўніка краіны Оз»...

А. Л. Ніякі гэта не рымейк, перапрашаю. Проста людзі, якія рабілі і «Ну, пачакай!», і «Тома і Джэры», добра валодалі сваёй прафесіяй і выкарыстоўвалі галоўны закон кінадраматургіі, адпаведна якому заўсёды мусяць быць герой і антыгерой. А сучасны фільм «Маша і мядзведзь» — няўжо такі самы рымейк? Там таксама ж два героі, таксама адзін аднаго даймаюць.

А. Т. Маё меркаванне — «Ну, пачакай!» ўсё ж такі не кіч. Я думаю, гэта жанр, які называецца «камедыя». Чаплін слізгаў на бананавай скурцы, глядач смяяўся... І гэтая скурка, узведзеная ў нейкую ступень, па-ранейшаму працуе. Драматургія працуе на эмоцыях.

А. Л. Можна слізгаць на той жа скурцы па-рознаму.

А. Т. Зразумела, таму і прыдумваюць розныя варыянты... Я вырасла на «Ну, пачакай!»... Мы смяяліся шчыра, эмоцыя — гэта тое, што павінен правакаваць твор мастацтва... З часоў Арыстоцеля тых асноўных эмоцый тры, гэта паўтонаў іх — куча... Страх, смех, слёзы. Калі вельмі груба дзяліць на жанры, трагедыя, камедыя і драма. Калі нейкая са згаданых эмоцый задзейнічана, то выніку мы ўжо дабіліся. «Ну, пачакай!» — гэта была для нас камедыя. Там былі закладзены маральныя нормы: Заяц — добры, ён есць моркву, займаецца спортам. Воўк — курыць, злы, агрэсіўны. Таму дабро ўвесь час перамагае, а зло падлягае пакаранню. Ваўка, вядома, б'юць, але не так страшна, як адбываецца ў «Томе і Джэры». Там жа ўвогуле раскачваюць гэтага беднага ката на блін... І ката мне нават больш шкада...

Л. Р. І мне таксама!

А. Т. Ваўка з «Ну, пачакай!» усё-ткі было менш шкада, бо яго сацыялізавалі як хулігана... А кот у «Томе і Джэры» ўсяго толькі выконвае сваю кашэчую місію: ловіць мыш. «Маша і мядзведзь» — таго ж плану з'ява, толькі на больш сучасным узроўні, таксама камедыя сітуацый... І мне там шкада мядзведзя. Але факт: гэта на сённяшні дзень па статыстыцы самае прадаваемае кіно ў свеце! Для мяне, дарэчы, гэта загадка... Ход не новы...

Л. Р. Значыць, адпавядае ўспрыманню сучаснага пакалення дзяцей... У свой час беларускі крытык Варлен Бечык напісаў востры артыкул пра дзіцячую літаратуру «Толькі без сю-сю»... Асуджаў падладжванне пад дзяцей, прымітыўную замілаванасць... Але якая ўжо замілаванасць, калі героя бясконца лупяць да паўсмерці?

А. Т. Не магу сказаць, што сёння згаданага «сю-сю» няма... Калі яно добра зроблена — мае права быць. Цікава бывае назіраць, як самі дзеці ствараюць анімацыйнае кіно. Мы з Аляксандрам былі на фестывалі дзіцячай творчасці, які праводзіцца раз на год «Зялёным крыжам» у Смалявічах. Аказваецца, у Беларусі вельмі шмат студый дзіцячай анімацыі, і часам дасылаюць вельмі цікавыя работы. Можна бачыць асаблівасці мыслення аўтараў у залежнасці ад узросту. Вось у пэўным узросце дзіця добра ўспрымае яркія колеры, пасля — развіваецца ўспрыманне нюансаў... Аніматарам трэба дакладна такое ведаць: калі трэба «сю-сю», калі можна ўскладніць...

ПРА ПАЛЯНДРУ, БАГДАНОВІЧА І ДЗЕДА ПА ІМЕНІ КАЦЯРЫНА

Л. Р. Наколькі папулярызуецца праз кінематограф для дзяцей менавіта беларуская культура? Бо кіно, анімацыя для дзяцей — найбольш уплывовы інструмент для патрыятычнага выхавання. Паглядзіце, як у Расіі выпускаюць цэлы шэраг мультфільмаў пра багатыроў, нацыянальных герояў...

А. Т. На нашай студыі знята вельмі шмат на гэтую тэму... Думаю, кожны рэжысёр анімацыі хоць раз выкарыстаў у якасці натхнення або беларускую казку, альбо сюжэт з беларускай гісторыі. Алена Пяткевіч зняла пра Марка Шагала і пра Максіма Багдановіча.

А. Л. На «Лістападзіку» атрымаў спецдыплом журы яе мультфільм, галоўны герой якога — паэт Максім Багдановіч. Калі яго паказвалі ў кінатэатры «Піянер», дзеці глядзелі, затрымаўшы дыханне. Мы нават у журы звярнулі на гэта ўвагу. Зроблена вельмі прафесійна, таму фільм заслугоўвае і ўвагі гледачоў, і прызоў.

Л. Р. Выходзіць, Максім Багдановіч можа стаць пазнавальным нацыянальным героем анімацыі?

А. Т. Так, зразумела! Як і Шагал, і героі Вялікай Айчыннай вайны... Згадаю мультфільм пра Шклоўскі тэатр, які быў фактычна беларускай Марыінкай... Цяпер я раблю праект, прысвечаны славянскай міфалогіі — прыгодніцкае фэнтэзі... Наш адказ расійскай анімацыі пра багатыроў, так бы мовіць. Там будуць і персанажы менавіта беларускай міфалогіі, напрыклад, Паляндра, Гарцукі... Героі нашай міфалогіі пры «раскрутцы» могуць быць не менш цікавыя, чым Зеўс ці Геракл, не абавязкова абмяжоўвацца толькі Несцеркам...

Л. Р. Спадар Аляксандр, а як вы выбіралі сюжэт для свайго фільма «Дзед», заснаванага на беларускім фальклоры?

А. Л. Выпадкова. Я пісаў іншы сцэнарый і якраз павінен быў яго прынесці назаўтра на студыю. А ўвечары мяне запрасілі ў госці на плоў у суседні дом. І перад адыходам мне патэлефанавала мастачка, з якой мы збіраліся працаваць, і сказала, што, здаецца, у Расіі быў на гэтую тэму зняты фільм. Я вырашыў залезці ў інтэрнэт і праверыць. І аказалася, ёсць такі фільм — «Разумная дачка» Алены Чарновай. Той жа сюжэт, на які я скончыў толькі што пісаць сцэнарый. Я пайшоў у госці, пасядзеў, напэўна, гадзіну... Пабег дадому. Было адзінаццаць вечара... Сярод маіх кніг меўся зборнік беларускіх народных казак. Я пачаў яго гартаць... Казка «Дзедаў скарб» была самая кароценькая. І я за дзве гадзіны напісаў па ёй сцэнарый і прынёс назаўтра ў студыю. А той сцэнарый, які я павінен быў прынесці, называўся «Кацярына». Паколькі на яго былі пададзеныя дакументы ў Міністэрства культуры, мне сказалі — мяняць назву нельга. Я кажу тагачаснаму дырэктару студыі — там жа герой Дзед, мужчына... І раптам — Кацярына!

А. Т. Не пашанцавала дзеду з іменем!

А. Л. Дырэктар кажа — дык прыдумай, можа, гераіню, якая ў дзеда закахаецца, хай яна будзе Кацярына. Такая дзіўная вось гісторыя атрымалася... У кіно бывае.

ПРА ЛЯЛЬКУ Ў ЧОРНАЙ СУКЕНЦЫ І ПРЫВІДА АРКАШУ

Л. Р. У 1990-я абрушыліся бар'еры цэнзуры, гэта датычылася і дзіцячай літаратуры. З'явіліся зборнікі «страшных гісторый», разнастайных жахалак... Дзеці ніколі не перастануць да такога цягнуцца. Ці гатовыя зняць жахалкі на беларускім матэрыяле?

А. Л. Калі ўключыць мозг, можна любы матэрыял выкарыстаць так, каб гэта прыносіла карысць і не выглядала кічам. І наадварот, можна любы матэрыял спаганіць, апошліць... Што такое дзіцячыя жахалкі? Калі я быў маленькі і чуў, як Воўк з'ядае Чырвоную Шапачку і бабулю, а пасля прыходзяць паляўнічыя і вызваляюць іх, разрэзаўшы ваўку жывот, для мяне гэта быў такі жах...

